# Мелодыі памяці








Аб'ект "Дом Валянціна Таўлая"
ДУ “Лідскі гісторыка-мастацкі музей”

# МЕЛОДЫІ ПАМЯЦІ

## да 110-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая

г. Ліда
“Пружмень”
2024

pawet.net

**Укладальнік**
**Алесь Хітрун,**
*навуковы супрацоўнік Лідскага*
*гісторыка-мастацкага музея*

**Мелодыі памяці. Да 110-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая**. Мастацка-дакументальны зборнік, 2024 г. Ліда, 116 с.
Выданне Лідскага гісторыка-мастацкага музея.
Рэдактар: Станіслаў Суднік.
Карэктар: Алесь Хітрун.

У зборнік уключана частка матэрыялу, які ўдалося сабраць за 10 гадоў пасля адзначэння 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая. Многія матэрыялы друкуюцца ўпершыню і перш за ўсё песні кампазітара Леаніда Шурмана, на вершы паэта Валянціна Таўлая і пра Валянціна Таўлая.
Змешчана і некаторыя творы памяці Валянціна Таўлая, напісаныя ў апошняе 10-годдзе.

Ⓛ Ліда, 2024

## У ДОМ ТВОЙ СЦЕЖКА ПРЫВЯЛА САМА…

Лідчына - край, які ўзгадаваў шматлікіх вынаходнікаў, гісторыкаў, паэтаў, артыстаў, мастакоў, палітыкаў і іншых прадстаўнікоў з розных прафесійных слаёў насельніцтва, дзякуючы якім Лідскі рэгіён вылучаецца асобным радком у гісторыі сівой мінуўшчыны.

Творчая асоба - гэта загадка. Жыццё творцы - кніга са шматлікімі старонкамі, яно парой пераплецена ў віры падзей, што насычаны рознымі недасказанымі фактамі, з'явамі, якія можна толькі разгадаць паміж радкамі. Нават пару дзесяткаў пражытых гадоў таго ці іншага творцы выклікаюць у даследчыкаў складанасці ў запаўненні белых плямаў, якія, бадай, не па сілах нават архівістам. У ліку такіх з'яўляецца беларускі паэт Валянцін Таўлай, жыццё і творчасць якога прайшлі праз Лідчыну. Пра гэтую асобу не стамляюцца пісаць у многіх сродках масавай інфармацыі. Але, парой, новых звестак не выяўляецца.

Спыняцца на творчай дзейнасці беларускага паэта, рэвалюцыянера, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны ў папярэднія гады для супрацоўнікаў Лідскага гісторыка-мастацкага музея не было вялікай нагоды. Не ўсе жыхары горада доўгі час ведалі, што ў Лідзе захаваўся дом, у якім жыў гэты дзеяч. Газетныя артыкулы змяшчалі толькі абагульняльную інфармацыю, якая не раскрывала зноў-такі новых звестак, не прыводзіла новых фактаў. Ды і за адкрыццё музея ў гэтым будынку доўгі час не браліся. Але памяць пра выдатнага чалавека захоўвалі.

З даведкі Лідскага філіяла РУП "Гродзенскае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры" стала вядома, што *"згодна з матэрыяламі інвентарнай справы капітальны будынак, размешчаны ў горадзе Лідзе па вуліцы Замкавая,7, упершыню быў праінвентарызавана нашай арганізацыяй 28 верасня 1950 года. Па наяўных у нас дадзеных год яго пабудовы 1926. Згодна тэхнічных пашпартоў карыстальнікамі домаўласніцтва з'яўляліся: 1970 год - гарадская*

*бальніца, 1975 год - домаупраўленне №1, 1997 год - гарадскі спартыўны аддзел. У 2011 годзе зарэгістравана на праве аператыўнага ўпраўлення за Дзяржаўнай установай "Лідскі гісторыка-мастацкі музей". Дадзенымі аб пражываючых і працуючых у домаўласніцтве філіял не валодае."*

Аднак, шмат іншых фактаў і гістарычных звестак пра будынак было знойдзена пазней. Хто жыў і што знаходзілася ў гэтым доме на той час? - гэтае пытанне найбольш зацікавіла аўтара гэтых радкоў, калі ён прыйшоў працаваць у музей.

Добра вядома тое, што напрыканцы верасня - пачатку кастрычніка 1939 года сюды, у дом жонкі Кіры (Стэры), засяляецца ўжо вядомы на той час паэт-рэвалюцыянер, літсупрацоўнік газеты "Уперад" Валянцін Таўлай (і жыве тут па 1941 год, пакідае дом і горад у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны). З матэрыялу Анатоля Клышкі "Змагарная паэзія Валянціна Таўлая" ("Беларускі кнігазбор", 2014 г.) вядома, што: *"Працуючы напярэдадні вайны ў лідскай газеце "Уперад", часта выступаў Таўлай з дакладамі на палітычныя і грамадскія тэмы на прадпрыемствах і ва ўстановах раёна. Першыя бомбы, скінутыя гітлераўцамі на Ліду, таксама засталі яго і супрацоўніка той жа газеты Якуба Міско на мітынгу галёшнай фабрыкі "Ардаль"…*

*… І ўсё так абрынулася ў першы ж дзень вайны. Жанчына, з якой Таўлай павязаў сваё сямейнае жыццё, знерваваная, што ён так беражліва і пільна, а таму і вельмі марудна перабірае розныя паперы - рукапісы сваіх твораў, калі трэба было чым хутчэй пакідаць горад, схапіла іх і выкінула ў выграбную яму. А гэта было яго найдаражэйшае, сутнаснае, захаванае падчас на газетным абрыўку, вынесенае сябрамі з турмы…*

*Таўлай падаўся да сваіх былых сяброў на Наваградчыну. Там сустрэне яго новы сямейны лёс - жанчына, з якой суровыя жыццёвыя дарогі пойдуць далей разам аж да заўчаснага канца паэта ў 1947 годзе. Яе таленавітае журналісцкае дараванне, якое яскрава выявілася ў матэрыялах "Падарожжа ў мінулае", "Гэта ўсё - знаёмыя шляхі" захавалі нам жывыя малюнкі Таўлаевага ваеннага і пасляваеннага тагачасся…"*

У чэрвені 1941 года паэт пакінуў гэты дом і горад Ліду. На шчасце, гэты будынак уцалеў ад ваеннай разрухі. Далей зноў невядомы перыяд. Аднак, у фондах Лідскага гісторыка-мастацкага музея захаваліся ўспаміны за 18 студзеня 1964 года Пятра Паўлавіча Дарашэвіча - брата жонкі Паўла Дзям'янавіча Таўлая (бацькі Валянціна Таўлая). Згодна з успамі-

намі стала вядома, што *"В 1939-1940 (?) гг. Валентин жил в доме, где теперь кожвендиспансер на II этаже. Жена его работала адвокатом"*. Дакладна вядома з пісем-зваротаў былога дырэктара Лідскага краязнаўчага музея Іванова Мікалая Ісаевіча, што ў 1964 годзе ў доме паэта размяшчаўся скурна-венералагічны дыспансер. Пасля гэтай даведкі само па сабе ўзнікла пытанне: а калі ж у гэтым доме была адкрыта згаданая медыцынская ўстанова? Зварот быў зроблены да загадчыка Лідскага скурна-венералагічнага дыспасера, што па вуліцы Інтэрнацыянальная - 4, Лебядзеўскага Міхаіла Пятровіча. Кампетэнтны і на дзіва зацікаўлены гістарычным мінулым, ён перадаў са свайго архіва фотаздымак медустановы таго часу, вакол якой абапал таксама падобныя адна на адну драўляныя хаты. А сам дом-герой такой жа самай канструкцыі, толькі драўляны і пакрыты белай тынкоўкай.

Загадчык дыспансера вёў летапіс скурна-венералагічнага дыспасера, які быў пачаты яго папярэднікамі Бялько Сяргеем Якаўлевічам, і нават захаваўся яго арыгінал-рукапіс даведкі (з 1953 па 1989 гг.), копіяй якой, між іншым, і падзяліўся з музеем. Далей звесткі працяг-валі занатоўвацца Краўчуком Іванам Бартковічам (з 1989 па 2002 гг.), Жыгала Кацярынай Мікалаеўнай (з 2002 па 2004 гг.) і працягнуты ім, Лебядзеўскім М.П. (з 2004 года). З храналагічных дадзеных стала вядома, што Лідскі скурна-венералагічны дыспасер быў адкрыты 1 жніўня 1944 года па вуліцы Камсамольская - 5 (цяпер Замкавая - 7) у драўляным прыстасаваным будынку са стацыянарам на 15 ложкаў. У дыспансеры працаваў 1 урач і 3 медыцынскія работнікі. У 1945 годзе стацыянар дыспансера пашырыўся да 25 ложкаў. Да 1950 года адкрыты клінічная і сералагічная лабараторыі. У 1958 годзе Загадам Міністра аховы здароўя БССР дыспансер быў перакваліфікаваны ў міжраённы дыспансер з тэрыторыяй абслугоўвання Лідскага, Іўеўскага і Воранаўскага раёнаў. Стацыянар пашырыўся да 35 ложкаў. І толькі ў 1967 годзе стацыянар дыспансера быў пераведзены ў памяшканне былой дзіцячай бальніцы па вуліцы Інтэрнацыянальнай.

На той час на першым паверсе ў чатырох пакоях знаходзіліся палаты для стацыянарных хворых. Уваход на першы паверх стацыянара быў той самы, што і ў будынку цяпер. Верагодна, каб не было кантакту пацыентаў дыспансера з амбулаторнымі хворымі, уваход на другі паверх, гэта значыць у амбулаторыю, быў зроблены звонку ўздоўж паўночнай сцяны будынка. Гэта значыць, да будынка прымыкалі драўляныя ўсходы, якія вялі на другі паверх.

На другім паверсе ў маленькім пакоі (з паўднёвага боку будынка) знаходзіўся кабінет галоўнага ўрача, у большым пакоі, які цяпер выхо-

дзіць вокнамі на захад, знаходзілася скурна-венерычная амбулаторыя. У пакоі, які выходзіць на поўнач, была лабараторыя. У невялікім калідорчыку туліліся гардэроб і рэгістратура.

Дзякуючы далейшым пошукам стала вядома, што ў гэтым доме ў 70-ыя гады размяшчаўся інтэрнат для мужчын ад завода "Лідсельмаш". Затым доўгі час гэты будынак быў прыстасаваны пад патрэбы аддзела па фізічнай культуры, спорту і турызму, ажно да 2004 года. Узначальвалі аддзел Тарасаў Алег Міхайлавіч, Драгун Валянцін Мікалаевіч, Баркоўскі Міхаіл Францавіч, Шот Мар'ян Часлававіч, Кудзі Севасцян Ігаравіч, Скоблікаў Яўген Аляксандравіч, Лакцевіч Аляксандр Рыгоравіч, Дубатоўка Іван Іванавіч, а ўжо пасля таго, як пакінулі гэты аб'ект, адказнасць за спартыўнае жыццё Лідчыны ўзялі на сябе Макей Аляксандр Мікалаевіч, Васілевіч Мікалай Іванавіч, Бажок Уладзімір Уладзіміравіч.

У тыя часы тут збіраліся аматары шахматна-шашачных спаборніцтваў, тут размяшчаліся спартыўныя таварыствы. Планіроўка была часткова зменена, бо змяніліся ўмовы пражывання. Замест пячнога абагрэву падвялі паравы, разам з тым унутры будынка паявіўся санвузел замест вулічнага. Каб падняцца на другі паверх, унутры былі збудаваны драўляныя ўсходы. А потым у 1989 годзе будынак абклалі чырвонай цэглай.

Як бачна, "гаспадароў" у гэтым доме перавярнулася нямала, а захаванню памяці аб вядомым дзеячы, здаецца, не прыдавалася ўвага.

Бясспрэчна, ушанаваннем творчай і жыццёвай дзейнасці паэта-рэвалюцыянера займаліся і ў іншых музеях Гарадзеншчыны. Напрыклад, як ва Установе культуры "Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя І.І. Стаброўскага", Дзяржаўнай установе культуры "Слонімская раённая бібліятэка імя Якуба Коласа", Установе культуры "Баранавіцкі краязнаўчы музей", у Баранавіцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя В.П. Таўлая, ДУА "Сярэдняя школа № 4 г. Баранавічы". Гэтыя ўсе ўстановы захоўваюць у сваіх фондах некаторыя матэрыялы. Да 2008 года працавала на Слонімшчыне Вялікакракоцкая бібліятэка імя Янкі Купалы, у якой быў сабраны багаты матэрыял пра жыццё і творчую дзейнасць В. Таўлая, але ж па дэмаграфічных абставінах установа была закрыта, і экспанаты былі расцярушаны па агульнакраязнаўчых музеях. Дом паэта ў Лідзе - гэта пакуль апошняя мемарыяльная кропка, якая захавала ў сваёй назве прозвішча творчай асобы. Насамрэч, аб стварэнні асобнага музея паэта ў Лідзе гаварылі ў чэрвені 1989 года, а зборам звестак пра гістарычную асобу займаліся яшчэ раней, з 1964 года. У фондах Лідскага гісторыка-мастацкага музея захоўваюцца адпаведныя лісты-звароты тагачаснага дырэктара Іванова Мікалая Ісаевіча, у якіх пазначаецца:

Ліст першы.

*"Председателю исполкома Лидского городского совета депутатов трудящихся тов. Семёнову А.С.*

*8 февраля 1964 г. исполнилось 50 лет со дня рождения белорусского поэта-революционера ВАЛЕНТИНА ТАВЛАЯ.*

*Имя ВАЛЕНТИНА ТАВЛАЯ тесно связано с нашим городом. Здесь он начинал учиться в начальной школе, а после освобождения его из Гродненской тюрьмы в сентябре 1939 г. - с сентября 1939 г. до самого начала Великой Отечественной войны - жил и работал (редакция газеты "Уперад") в городе Лида. Он жил в доме, в котором теперь размещается кожно-венерический диспансер, по ул. Комсомольской.*

*В честь 50-летия со дня рождения, которое широко отмечалось общественностью нашего города, клуб революционной, боевой и трудовой славы ходатайствует об установлении мемориальной доски на здании нынешнего кожно-венерического диспансера с надписью: "В этом доме с сентября 1939 г. и до самого начала Великой Отечественной войны - жил и работал белорусский поэт-революционер ВАЛЕНТИН ТАВЛАЙ".*

*Председатель клуба революционной, боевой и трудовой славы, директор Лидского краеведческого музея Н. И. Иванов."*

Ліст другі.

*"Лидский историко-краеведческий музей, г. Лида, Гродненская обл., ул. Советская, 24.*

*21 февраля 1964 г.*

*Минск. Редакция журнала "Маладосць"*

*Дорогая Лидия Сергеевна! Высылаю Вам несколько снимков, сделанных на литературном вечере в Лидском городском доме культуры, посвященном 50-летию со дня рождения дорогого и близкого Вам ВАЛЕНТИНА ТАВЛАЯ. Они не совсем удачны, а многие вообще не получились. Фотограф нечаянно испортил пленку при обработке. Очень жалко!*

*Ходатайствующее письмо о новом полном издании произведений Валентина Тавлая или о переиздании его книги, выпуска 1961 г. уже направили в два адреса: идеологический отдел ЦК КПБ на имя тов. Бровко П. выслать ли Вам копию этого письма? Может оно написано и не совсем удачно?*

*От имени клуба революционной, боевой и трудовой славы в исполком Лидского городского Совета депутатов трудящихся*

*направлено ходатайство об установлении мемориальной доски на доме, где жил и работал ВАЛЕНТИН ТАВЛАЙ.*

*Очень прошу Вас написать в Гродненский музей о передаче нам личных вещей ВАЛЕНТИНА ТАВЛАЯ, о которых мы с Вами условились. Желательно в копии.*

*С глубоким уважением и благодарностью к Вам директор Лидского краеведческого музея Н. Иванов."*

Як бачым, пачаткам музеефікацыі Таўлаевай спадчыны можна лічыць 1964 год, і асноўная заслуга ў гэтым былога дырэктара Лідскага краязнаўчага музея М. Іванова, які не дазволіў сцерці з гісторыі горада пакінуты тут след беларускага паэта-рэвалюцыянера.

Да 50-годдзя з дня нараджэння В. Таўлая ў 1964 годзе планавалася адкрыццё мемарыяльнай дошкі, на мерапрыемства была запрошана жонка-ўдава паэта Лідзія Сяргееўна Казлоўская (Таўлай). Па звестках, якія ёсць у Лідскім гісторыка-мастацкім музеі, вядома, што мемарыяльная дошка была ўстаноўлена ў 1965 годзе. Аб гэтым сведчыць невялічкая нататка ў лідскай газеце "Уперад" (№ 45 ад 21.031970): *"У гэтым доме з верасня 1939 года да пачатку Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў беларускі паэт-рэвалюцыянер Валянцін Таўлай". Такі тэкст напісаны на мемарыяльнай дошцы, якая нядаўна з'явілася на фасадзе дома № 5 па вуліцы Камсамольскай. Тым самым аддадзена даніна светлай памяці вядомага рэвалюцыйнага дзеяча Заходняй Беларусі".* А рашэннем абласнога выканкама за № 91 ад 24.03.1986 г. дошка прызнана мастацкай каштоўнасцю мясцовага значэння.

Так сталася, што праз 25 год мемарыяльная шыльда, якая напамінала жыхарам горада пра свайго земляка, не ўцалела. Газета "Уперад" за 11.06.1989 года ў матэрыяле "Дом Таўлая" паведаміла: *"Дом, у якім у апошнія гады размяшчаўся гарадскі спорткамітэт, прыйшоў у заняпад. І вось было рашана правесці яго рамонт. Былі выдзелены неабходныя сродкі, складзена адпаведная дакументацыя. Рашано захаваць тую самую планіроўку, якая была пры жыцці тут паэта. Як запэўнілі адказныя таварышы з гарадской архітэктурна-вытворчай групы, пакоі застануцца той жа планіроўкі, пры тых жа памерах, што вельмі важна з пункту гледжання спадчыннасці. На жаль, не будзе захаваны іх інтэр'ер. Ды яго ўжо і цяжка ўстанавіць: шматлікія бягучыя рамонты зрабілі сваю справу. Ды і гаспадароў у доме перавярнулася нямала. Фасад будзе абліцаваны чырвонай цэглай. Гэта неабходна, тым больш, што будынак драўляны і ўжо даволі сур'ёзна пашкоджаны гніллю. Такое рашэнне пытання скіроў-*

*вае на пэўны аптымізм. Але хочацца звярнуць увагу на, як кажуць, адваротны бок медаля. Аб значнасці і каштоўнасці для нас гэтага дома гаварыла мемарыяльная дошка. Праўда, не вельмі прывабная па прыгажосці. Але ўсё ж такі заклікала да памяці. Вось з ёй і адбылася кур'ёзная сітуацыя, якую інакш не назавеш, як абыякавасцю і раўнадушшам. Як высветлілася потым, яе зняцце са сцяны (перашкаджала будаўнічым работам) не было закладзена ў каштарыс. Вось як. Здавалася б, такая дробязь - смеху варта. Але здымаць яе рабочыя адмовіліся. Потым пад націскам прыняліся ўсё ж за працу і... паламалі.*

*...Дарэчы аб рамонце. Сродкаў на яго на бягучы год выдзелена дастаткова. Як кажуць, ёсць з чым разварнуцца. Увесці ў строй аб'ект плануюць у тэрмін. І хочацца верыць, што дом Таўлая ў хуткім часе прыйдзе да нас памаладзелым, упрыгожыць не толькі наш старажытны горад, але і наша жыццё. Памяць аб выдатным песняры зямлі беларускай, паэце-рэвалюцыянеры павінна жыць не толькі ў мемарыяльнай дошцы. Яе трэба толькі аднавіць і зрабіць больш прыгожай. Думаецца, што таксама не лішне будзе падумаць аб мінулым паэта. На першым часе адкрыць хаця б невялікую экспазіцыю ў адным з пакояў дома. Сваё важкае слова аб гэтым павінны сказаць энтузіясты, нераўнадушныя да лёсу нашай спадчыны, і ў першую чаргу камсамольцы і моладзь, школьнікі, нефармальныя аб'яднанні..."*

Увесь гэты час грамадскасць горада, Лідская гарадская арганізацыя ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", члены літаратурнага аб'яднання "Суквецце" пры рэдакцыі "Лідскай газеты" дабіваліся тут адкрыцця менавіта літаратурнага музея, бо былі ідэі адкрыць нешта кшталту Дома славы для ўшанавання знакамітых людзей Лідчыны. З 2004 года пры садзеянні раённых уладаў сітуацыя зрушылася ў бок музея, паступова быў выселены аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму, перапрацавана канцэпцыя, праведзены капітальны рамонт. І згодна рашэнню выканкама № 773 ад 12.07.2010 года будынак быў перададзены музею для арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў на літаратурную тэматыку. І вось дзякуючы рэспубліканскаму святу хлебаробаў "Дажынкі-2010", якія прайшоў у Лідзе, 22 верасня 2010 года, адкрылі літаратурны музей як філіял, а пасля праз год-другі як аддзел, а цяпер - аб'ект "Дом Валянціна Таўлая" ДУ "Лідскі гісторыка-мастацкі музей". 8 лютага 2014 года была арганізавана ўрачыстасць да 100 год з дня нараджэння Валянціна Таўлая, у якой прынялі ўдзел дачка паэта Галіна, яго сваякі. Былі адкрыты мемарыяльныя дошкі работы лідскага скульп-

тара Рычарда Грушы на будынках рэдакцыі "Лідскай газеты" і літаратурнага аддзела музея, а таксама здзейснена экскурсія па аб'ектах горада, якія звязаны з жыццём і творчай дзейнасцю паэта "Шляхам Валянціна Таўлая", адбылася прэзентацыя кнігі "Этапы жыццёвых дарог" аўтара Анастасіі Аляксандраўны Каладзяжнай - навуковага супрацоўніка гісторыка-мастацкага музея.

Паколькі дом паэта быў адкрыты для арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў на літаратурную тэматыку Лідчыны, то і ў яго канцэпцыі прапісана адкрыццё выставак і экспазіцый на адпаведную тэму. Асобна вызначалася экспазіцыя "З мастацкім слова па жыцці", якая была прадстаўлена зборнікамі мясцовых літаратараў, рукапісамі, фотаздымкамі. Цяпер яна мадэрнізавана ў выстаўку-гасцёўню "Іх слова аб'яднала…". На яе базе праходзяць сустрэчы з вядомымі беларускімі пісьменнікамі, якія таксама папаўняюць фонды музея сваёй друкаванай прадукцыяй.

Так ці інакш, памяць пра Валянціна Таўлая тут захоўваецца. Дзякуючы ўспамінам сястры паэта Ніны Таўлай, супрацоўнікі лідскага музея рэканструявалі пакой, у якім працаваў паэт. Цяпер гэта мемарыяльны пакой паэта. Мэбля - стол з друкаркай, крэсла-гушкалка (перадаў са свайго лецішча лідскі паэт Міхась Мельнік), шафа, этажэрка з кнігамі тога часу - усё гэта прыцягвае наведвальніка. Што тычыцца аўтэнтычнасці, мемарыяльнасці прадметаў, то ў гэтым пакоі на першы погляд не кожны іх знойдзе. А гэта старая лямпа - жырандоля, якая была перададзена з Наваградка, мяркуецца, што такая звісала са столі і ў кватэры паэта, калі ён жыў у тым горадзе. Ёсць і сцізорык, прыложкавая тумбачка, якія былі перададзены ад Мікалая Грабёнкіна - сына камандзіра партызанскага атрада асобага прызначэння "Буравеснік" Мікалая Іванавіча Грабёнкіна з Гродна. Па звестках, гэты ножык і тумбачка былі падараваны Таўлаем і захоўваліся як каштоўны напамінак. Акрамя гэтага, тут размяшчаецца шэраг фотаздымкаў, якія дапамагаюць паглыбіцца ў мінулае Валянціна Таўлая, і, разам з тым сведчаць пра яго жыццё і дзейнасць, нават і пра яго дзяцінства ў Лідзе…

Лічыцца, што гэта адзіны музей у Беларусі, а менавіта дом, у якім захоўваецца памяць пра выдатнага нацыянальнага дзеяча. Яна займае асобнае месца ў культурнай прасторы горада і раёна і такім чынам стварае новы накірунак у яго развіцці. Тут, у Лідзе, у далёкім 1922-1923 годзе прайшлі першыя гады вучобы будучага паэта - ва Усеагульнай школе, якая размяшчалася за паўночным бокам Лідскага замка (у 1930-я гады гэта школа № 5 імя Людвіка Нарбута, не ўцалела падчас Вялікай Айчыннай вайны) быў напісаны першы верш на польскай мове "Вера-

бейкі". У Лідзе паэт працаваў у рэдакцыі лідскай газеты "Уперад" (будынак размяшчаўся па сучаснай вуліцы Савецкай, непадалёку ад Свята-Міхайлаўскага кафедральнага сабора, падчас Вялікай Айчыннай вайны быў рабураны), у якой друкаваў матэрыялы, вершы як уласнага сачынення так і сяброў па пяры: Ніны Тарас, Якуба Міско, Пятруся Граніта, Піліпа Пестрака, Максіма Танка. У Лідзе (прыкладна, дзе размяшчаецца стаянка каля падатковай інспекцыі) жылі яго блізкія сваякі бацька Павел Дзям'янавіч, мачыха Сцепаніда Паўлаўна, брат Аляксандр, сястра Ніна. На жаль, увесь гэты квартал быў спалены немцамі падчас вайны. У Лідзе паэт быў пазбаўлены волі: разам з роднымі яго кінулі ў фашысцкую турму. Краты і камеры захаваліся да нашага часу (цяпер тыя памяшканні з'яўляюцца складамі мэблевай фабрыкі "Івацэвічдрэў").

У сувязі з тым, што прадметных матэрыялаў, якія мелі б непасрэднае дачыненне да жыцця і творчай дзейнасці не захавалася, было вырашана адкрыць Дом-музей толькі з адным мемарыяльным пакоем (які быў стылізаваны па ўспамінах сястры паэта Ніны Таўлай), а астатнія задзейнічаць выстаўкамі на тэматыку літаратурнага жыцця Лідчыны. Такім чынам Дом Таўлая стаў адным з культурных цэнтраў горада, які займеў магчымасць для арганізацыі і правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў, літаратурных пасяджэнняў, паэтычных чытанняў, конкурсаў, месцам для інтэрактыўных праграм і г.д. З гэтай мэтай была прапанавана канцэпцыя і статус для аб'екта, якая растлумачыла адсутнасць арыгінальных прадметаў для экспазіцыі пры наяўнасці мемарыяльнай прасторы. Дадзеная прапанова дапамагла пашырыць цэнтр культурнага поля Лідчыны, зменшыць шматфункцыянальнасць яе прасторы, а таксама форму падачы інфармацыі ў экспазіцыі.

Мэтавая аўдыторыя музея дастаткова шырокая - гэта і маладое пакаленне: школьнікі, студэнты, а таксама старэйшае насельніцтва. Для першых - гэта магчымасць праявіць свае здольнасці ў літаратурным жыцці горада, паспрабаваць сябе ў інтэрактыўных мерапрыемствах, а для другіх - забяспечыць свой вольны час у своеасаблівых тэматычных пасяджэннях дзеля раскрыцця пэўных гістарычных звестак, якія, напрыклад, маюць сувязь з мінулым ваенным жыццём. У гэтым кірунку з 22 лютага 2015 года працуе музейна-асветніцкі праект "Гістарычная гасцёўня "Память за собою позови", вынікам якой стаў выхад кнігі ўспамінаў лідзян - сведкаў Вялікай Айчыннай вайны "Память - главный свидетель" (2018 г.) аўтара - навуковага супрацоўніка музея Каладзяжнай А.А.

Аднак, час не стаіць на месцы, Дом-музей перажыў перамены, творчая спадчына Валянціна Таўлая была па-новаму перагледжана, а

дакладней, адкрыта шмат новага і невядомага пра літаратурную і грамадскую дзейнасць паэта. За гэты час знойдзена нямала дакументаў (матэрыялаў, фотаздымкаў), якія раскрываюць вобраз беларускага паэта-патрыёта. Разам з тым, быў разгаданы лёс першай жонкі паэта Кіры Брандт, той жанчыны, якая пражывала ў гэтым доме, а падчас вайны - у Вільні, дзе і пахавана. Пошукі, адназначна, будуць і далей працягвацца, даследчыкі пройдуць тымі дарогамі, якімі ішоў сам беларускі паэт: праз Расію, Польшчу, Літву.

Але ўсё ж не ўтрымліваючы "родных" прадметаў, або маючы іх у адзінкавай колькасці, Дом-музей робіць акцэнт на мемарыялізацыю месца і самога дома, ствараецца атмасфера, якая характэрная для творчай асобы. У працяг традыцый, закладзеных тут пры жыцці паэта, гучаць вершы, выконваюцца музычныя творы таго часу, адзначаюцца гадавіны, а таксама святкаванне пэўных датаў у календары і г.д. Разам з тым, праводзіцца даследчая праца па выяўленні гістарычных звестак пра дом, вывучаюцца архівы, праводзяцца сустрэчы з літаратарамі.

У разгледжаных асноўных аспектах дзейнасці Дома В. Таўлая Лідскага гісторыка-мастацкага музея, трэба зазначыць, што галоўнай іх мэтай застаецца захаванне памяці і творчай спадчыны пісьменніка, аднак сучасны соцыюм дыктуе новыя формы ўзаемаадносін з аўдыторыяй, і разам з тым, мяняюцца канцэпцыі і стратэгіі развіцця, якіх пастаянна павінен прытрымлівацца Дом-музей. Актуалізацыя культурнай спадчыны ў Доме паэта ажыццяўляецца пры дапамозе выкарыстання інавацыйных форм камунікацыі з наведвальнікамі: музейна-адукацыйных праграм для дзяцей, музейных святаў з выкарыстаннем прыёмаў, характэрных для тэатральнага мастацтва і жывой гутаркі з пісьменнікамі, краязнаўцамі. Супрацоўнікі Дома-музея падтрымліваюць сувязь са сваякамі Валянціна Таўлая, з яго сябрамі, з пісьменніцкім саюзам, праводзяць пешыя экскурсіі "сТАЎЛенне" па аб'ектах горада, звязаных з дзейнасцю паэта - усё гэта прыцягвае публіку да жывой зацікаўленасці вядомых землякоў, да багатай літаратурнай спадчыны прынёманскага краю.

Дом, у якім жыў В.Таўлай, можна сцвярджаць, з'яўляецца мемарыяльным, бо не быў знесены, парушаны. Зразумела, што знешні выгляд яго зменены, унутраная планіроўка - таксама. У гэтым плане засталася толькі мемарыяльная прастора. Але ж дваровая тэрыторыя таксама павінна застацца нязменнай. І па-гэтаму, супрацоўнікі Дома В. Таўлая, маюць мэту захаваць мемарыялізацыю дома і такім чынам упарадкаваць прымузейную тэрыторыю дэкаратыўнай агароджай і стварыць дваровую экспазіцыю з прымяненнем ландшафтнага дызайну. Дзеля ажыццяўлення задуманага з’явілася неабходнасць устанавіць паркавую

скульптуру ў выглядзе кнігі, пяра, або друкаркі, што стала б прыцягальным прадметам для турыстаў. На сённяшні дзень музейшчыкі стараюцца пакінуць арыгінальны выгляд у двары: насупраць мемарыяльнага пакоя ў разбітай клумбе яны садзяць кветкі, якія раслі ў 1939-1941 гадах калі жыў у гэтым доме Валянцін Таўлай.

Архітэктурнай часткай будынка Дома-музея з'яўляецца балкон, які ўжо не першы год у летні час выкарыстоўваецца для паэтаў і музыкаў горада ў арт-праграме "Балкон" культурна-турыстычнага праекта "Замкавы гасцінец".

Да 105-годдзя з дня нараджэння паэта, у 2019 годзе, быў распрацаваны інсцэніраваны аповяд "У Таўлая пабываем". Гэта новая форма правядзення экскурсіі, якая заключаецца ў тым, што калі наведвальнік прысутнічае на інсцэніроўцы ў мемарыяльным пакоі, то ён быццам бы трапляе ў мінулы час - 1939-1941 гады, а менавіта ў жылы пакой паэта Валянціна Таўлая. Праз дыялог супрацоўнікаў музея, якія пераўвасоблены ў вобразы паэта В. Таўлая, яго жонкі Кіры, ахмістрыні, чытальніка яны дазнаюцца пра жыццёвы і творчы шлях паэта ў горадзе Лідзе. Гэтая тэатралізацыя цяпер запатрабаваная і паказана на "падмостках" у мемарыяльным пакоі ўжо некалькі разоў і з кожным разам з новымі дзеяннямі і звесткамі, якія прадугледжваюць тую ці іншую гістарычную дату.

Паколькі школьная навучальная праграма не ўзгадвае творчасць паэта, то супрацоўнікі Дома Валянціна Таўлая праз музейна-педагагічныя і інтэрактыўныя дзеянні гэтыя веды ўзнаўляюць. Дзеці ахвотна паглыбляюцца ў мінулае праз забавы: апранаюць доўгую кашулю "навыпуск", у якой маленькі Валя хадзіў у лідскую школу, дзе напісаў першы верш "Верабейкі" на польскай мове. Дарэчы, твору ў 2022 годзе споўнілася 100 год і дзеля гэтай гучнай даты была адкрыта выстаўка "Вераб'іная праСТОра". Вучні, як паэты-пачаткоўцы спрабуюць свае здольнасці ў складанні верша "Верабейкі", у квэст-гульні знаёмяцца з прадметамі ў мемарыяльным пакоі, як газетчыкі, ствараюць макет лідскай газеты "Уперад", у рэдакцыі якой працаваў В.Таўлай і інш. Было заўважана, што незвычайнай архітэктурнай аздобай тут з'яўляецца металічная лесвіца, якая вядзе на другі паверх і налічвае на пад'ём і спуск 32 прыступкі, то паводле іх цяпер для вучняў-пачаткоўцаў развучваецца беларускі алфавіт, а для прыезджых пісьменнікаў-гасцей, яе пярылы служаць у якасці галерэі сімвалічных бірак з аўтографамі на іх.

Супрацоўнікі дома-музея збіраюць па крупінках усё, што звязвае сваякоў Валянціна Таўлая як па лініі бацькі, так і па лініі роднай маці і мачыхі. Ніна Таўлай дасылае свае ўспаміны, якія ўжо былі надрукаваны

пад назвай "Раны сэрца майго" ў літаратурна-мастацкім зборніку "Ад лідскіх муроў" у № 9 за 2016-2019 гг., дасылае сястра паэта і складзеныя ёю радаводы. У №10 за 2020-2021 гг. была нанова змешчана "Аповесць пра Таўлая" Уладзіміра Калесніка, якая мела свайго чытача ў часопісе "Полымя" ў 1964 і 1965 годзе.

Усё гэта так ці інакш патрабуе часу для далейшага даследавання. І будзем спадзявацца, што ў школьнай навучальнай праграме знойдзецца месца і для вывучэння творчасці Валянціна Таўлая. Яшчэ шмат таямніц не разгадана ў кароткім жыцці паэта. Але паступова фонды і архівы разгорнуць новыя старонкі яго творчасці. І як заўсёды, яны стануць прыцягальнымі для даследчыкаў.

Радуе і тое, што 17 верасня 2020 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка згадаў: *"Мы памятаем тую жорсткасць, з якой было задушана Скідзельскае паўстанне, калі польскія жандары рэзалі ўсіх запар, не шкадуючы старых, жанчын і дзяцей. Памятаем дзікія катаванні, якім падвяргаліся вязні канцлагера Бяроза-Картузская. І будзем памятаць герояў, якія сталі сімваламі народнага супраціву ў Заходняй Беларусі: Сяргея Прытыцкага, Веру Харужую, дзеда Талаша, Кірыла Арлоўскага, Станіслава Ваўпшасава і іншых нашых землякоў. Мы і сёння бачым сілу і веліч непакоранага беларускага духу ў творчасці Максіма Танка, Валянціна Таўлая, Максіма Сеўрука, Рыгора Шырмы і многіх іншых. Бачым, адчуваем і памятаем..."*. Так, будзем памятаць і верыць у тое, што мова і нацыянальная свядомасць, за якія аддаў сваё жыццё паэт-рэвалюцыянер Валянцін Таўлай, будуць і далей жыць у нашых сэрцах.

Трэба зазначыць, што ў Доме паэта распрацаваны і іншыя праекты. 10 лютага 2022 года ў Рэспубліканскім конкурсе культурных праектаў патрыятычнай тэматыкі ў намінацыі "Лепшы інтэрактыўны музейны праект для спецыяльных аудыторый або інклюзіўны праект" Лідскі гісторыка-мастацкі музей атрымаў перамогу за інклюзіўны праект "Перадай дабро па крузе...", які праводзіцца на базе Дома Валянціна Таўлая. Гэты праект разлічаны на творчых людзей з абмежаванымі магчымасцямі: паэтаў, артыстаў, мастакоў, музыкаў і інш.

Жыццё ідзе, а гэта значыць, што планамі і ідэямі ў папулярызацыі беларускага паэта і дома, у якім ён жыў, яшчэ не раз падзяляцца і іх жа рэалізуюць лідскія музейшчыкі.

* * *

Кожны пісьменнік марыць выдаць хоць адну кнігу. Валянцін Таў-

лай так і не дачакаўся яе. Але ж, выдадзены пасмяротны томік замест названага ім "Шляхі і краты" пад вокладкай "Выбранае" паклаў пачатак збору далейшых твораў паэта-барацьбіта, успамінаў, падзеяў, звязаных з яго жыццём і творчымі справамі. Спадчына Валянціна Таўлая вядомая і за межамі краіны, бо яго творы ў свой час былі перакладзены на рускую, украінскую, польскую, літоўскую, англійскую, французскую і іншыя мовы свету. Валянціну Таўлаю прысвячалі і прысвячаюць вершы, праводзяць конкурсы, яго імем названы бібліятэкі, вуліцы. Бясспрэчна, на гэтым справа не спынілася і ў горадзе Лідзе. У 2023 годзе споўнілася 60 год вуліцы Таўлая, перайменаванай 11 красавіка 1963 года з вуліцы Лідскай. У 2024 годзе бібліятэка-філіял № 6 раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы, якая носіць імя Валянціна Таўлая адзначыць свае 60 год з дня заснавання.

У памяць пра паэта запланавана арганізацыя Літаратурнай прэміі імя Валянціна Таўлая на лепшы патрыятычны твор. Вядомыя мастакі, скульптары стваралі і ствараюць мастацкія работы паводле жыцця і дзейнасці паэта. Дзеляцца ўспамінамі ў сваіх мемуарах пісьменнікі, лёсы якіх перасякаліся з паэтам-змагаром падчас розных жыццёвых абставінаў. На вершы В. Таўлая складаюць песні. Паэту-патрыёту прысвячаюць ўжо свае вершы, пішуць драматычныя паэмы.

Яшчэ ў 1986 годзе ў кнізе паэзіі "Падземныя замкі" Міколы Арочкі была змешчана драматычная паэма "Мелодыя Таўлая", у якой аўтар заклаў вобраз высокай ахвярнасці нацыянальна-вызвольнага змагання ў Заходняй Беларусі. Годам пазней, у 1987 годзе, у свет выйшаў першы зборнік з серыі "Тэатр юнага гледача" пад назвай "Галоўны экзамен". На яго старонках чытач пазнаёміўся з творам Міхася Рудкоўскага - сцэнарыем тэатральна-эстраднага прадстаўлення пра жыццё і творчасць паэта-рэвалюцыянера Валянціна Таўлая "Пілую вершам краты", у якім закладзены вялікі зарад мужнасці і рэвалюцыйнай рамантыкі. У афармленні сцэнічнага прадстаўлення значную ролю бралі на сябе святло і музыка! Так, тая музыка і мелодыя, якая ў свой час лілася з самога паэта пры жыцці. У гэтым пасадзейнічалі сем песень беларускага кампазітара Леаніда Шурмана на вершы Валянціна Таўлая і адна - на верш Максіма Танка, прысвечаны памяці паэта-змагара.

У пачатку студзеня 2019 года аўтару гэтых радкоў пашанцавала выйсці на сувязь з Леанідам Барысавічам Шурманам. Падчас перапіскі і тэлефонных перамоў з ім была выказана просьба даслаць ноты на словы В. Таўлая. Па дасланых ім рукапісных варыянтах лідскія музыкі, да якіх даводзілася звяртацца з мэтай агучыць творы, адмаўляліся ад выканання, казалі, што неабходна яшчэ і харавое выкананне. Дык у

гэтай справе ў дапамогу прыйшоў сам кампазітар. Леанід Барысавіч у 2022 годзе ўшчыльную ўзяўся за справу. Ад яго час ад часу пачалі па-ступаць камп'ютарныя наборы нотаў з тэкстам для друку. І разам з тым, у планах кампазітара было зрабіць запіс песень у музычным гучан-ні. 28 снежня 2022 года Леанід Барысавіч па тэлефоне паведаміў, што даслаў астатнія ноты на вершы В. Таўлая ў той паслядоўнасцю, якая павінна быць у друку. Увесь гэты нотны арсенал планавалася выдаць асобным выданнем. Аднак, сэрца кампазітара спынілася 29 студзеня 2023 года...

Для аматараў музычнага кірунку ў мастацтве ён запомніўся як таленавіты кампазітар, аўтар песень, аранжыроўшчык і музыка. Амаль шэсць дзясяткаў гадоў ён прысвяціў галоўнай справе свайго жыцця - музыцы. Леанід Шурман напісаў больш за 450 песень і інструменталь-ных п'ес, большасць з якіх выконваюць артысты беларускай эстрады і розныя музычныя калектывы рэспублікі. У рэпертуары Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі "Свята", мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца ўраджэнец Лідчыны Вячаслаў Статкевіч, значыцца больш за 20 яго твораў.

Леанід Барысавіч Шурман нарадзіўся 30 сакавіка 1950 года ў горадзе Бірабіджан (цяпер Хабараўскі край Расійскай Федэрацыі). Пасля ён скончыў выканаўчы факультэт па класе баяна Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі ў горадзе Мінску. У далейшым Леанід Барысавіч жыў і працаваў у Беларусі. Акрамя стварэння і выканання музычных твораў Леанід Шурман браў удзел у шматлікіх музычных конкурсах у якасці члена журы: Рэспубліканскіх і Міжнародных конкурсаў, Рэспублікан-скага фестывалю-конкурсу дзіцячага мастацтва "Львёнок" ("Лідскі вянок"), які праходзіў у Лідскай дзіцячай школе мастацтваў.

За сваю самаадданую працу і важкі ўклад у беларускае мастацтва кампазітар быў уганараваны медалём "За працоўныя заслугі". У 2015 годзе ён быў узнагароджаны ім указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Таксама Леанід Барысавіч меў званне заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь (2015), а таксама быў членам Беларускага саюза кампазітараў (2020).

У апошняй размове, ён мне прызнаўся, хто быў ініцыятарам у музычным ушанаванні творчасці Валянціна Таўлая. Гэтым чалавекам з'яўляецца беларуская паэтэса, крытык і перакладчык Ніна Загорская. Яна, між іншым, уваходзіла ў рэдакцыйную калегію як укладальнік твораў для выкарыстання ў Тэатры юнага гледача з аднаіменнай кніжнай серыі.

Ніна Сямёнаўна Загорская нарадзілася 16 ліпеня 1940 года ў вёсцы

Загор'е Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Першыя веды яна атрымала ў Загорскай пачатковай школе, потым - у Сталовіцкай сярэдняй школе, якую закончыла з залатым медалём. У 1957-1962 гадах Ніна Загорская вучылася на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала старшым рэдактарам на Брэсцкай студыі тэлебачання, лектарам Брэсцкага гаркама КПБ. У 1973 годзе Н. С. Загорская была накіравана на працу адказным сакратаром у рэдакцыю газеты "Зорька". У 1974 годзе скончыла Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. З 1976 года - адказны сакратар рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач Беларускага радыё, з 1980 года - загадчык аддзела навукі і мастацтва часопіса "Полымя", з 1982 года - галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР.

У друку выступае з 1958 года. Аўтар зборнікаў вершаў "Радар" (1975), "Явар" (1982), "Мне добра з вамі" (1989). Ніна Сямёнаўна выступае і як публіцыст, крытык. У перыёдыцы друкаваліся яе рэцэнзіі на кнігі паэзіі Г. Бураўкіна, М. Лужаніна, П. Панчанкі, М. Танка, Я. Янішчыц і інш. Прымала ўдзел у распрацоўцы дзяржаўных праграм да 500-годдзя з дня нараджэння Францішка Скарыны, да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, да 180-годдзя з дня нараджэння Паўлюка Багрыма. Была членам праўлення Беларускага аддзялення Міжнароднага фонду славянскага пісьменства і культуры. Ніна Сямёнаўна была дацэнтам кафедры тэатральнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. З 2006 года працавала ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Кіраўнік і натхняльнік рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі "Шлях да Святыняў з Благадатным Агнём ад Гроба Гасподня", якая з 1994 года праводзіцца да Дня беларускага пісьменства.

Член Саюза журналістаў БССР з 1965 года, Саюза пісьменнікаў БССР з 1982 года, Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі з 1986-га. У 1992 годзе Н. С. Загорская ўганаравана званнем "Заслужаны работнік культуры Беларусі". Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" (2004). Узнагароджана ордэнам Святой Раўнаапостальнай княгіні Вольгі.

Аб тым, як узнікла ідэя ўшанаваць свайго земляка з Баранавічаў у песенным выкананні падзялілася шаноўная Ніна Сямёнаўна:

*"Чатырнаццаць гадоў - з 1982-га па 1996 год - я была Галоўным рэдактарам РРК - Рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР.*

*РРК ажыццяўляла дзяржаўны заказ на стварэнне твораў для літаратурна-драматычных, тэатральных, музычных, харэаграфіч-*

*ных - найперш калектываў народнай творчасці, але і прафесійных таксама!*

*У грамадскім мастацкім савеце Міністэрства культуры, у якое ўваходзіла упраўленне народнай творчасці, налічвалася дзевяноста шэсць вядомых пісьменнікаў, драматургаў, кампазітараў, харэографаў, рэжысёраў, артыстаў. Кіраўнікамі прафесійных і аматарскіх калектываў былі Алесь Петрашкевіч, Іван Пташнікаў, Юрый Семяняка, Міхась Дрынеўскі, Мар'ян Наско, Міхаіл Казінец...*

*За чатырнаццаць гадоў РРК праз Дзяржаўныя выдавецтвы "Беларусь", "Юнацтва", Рэспубліканскі Цэнтр народнай творчасці, штотыднёвую газету "Літаратура і мастацтва", іншыя друкарні Беларусі выдала звыш сямідзесяці рэпертуарных зборнікаў. Выдатныя вершы Валянціна Таўлая былі заказаны і кампазітару Леаніду Шурману.*

*Мастацкі Савет РРК Міністэрства культуры рэкамендаваў песні Л. Шурмана да набыцця, уключэння ў Рэпертуар творчых калектываў, друку і выкарыстання на тэатральных падмостках.*

*Галоўны рэдактар Рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусі пісьменніца Ніна Загорская.*

*01. 05. 2023 г., Загор'е".*

На старонках гэтага выдання, якое атрымала назву "Мелодыі памяці", чытач пазнаёміцца з нотамі Леаніда Шурмана на словы Валянціна Таўлая ("Кастрычніцкі салют", "Успаміны", "Хлопцы", "Ранак Перамогі", "Аддаю шчыры голас салдацкі", "Першамайскія сцягі", "Камень за каменем") і Максіма Танка ("Яго напевам выпаў слаўны лёс"), а таксама з вершамі, напісанымі паэтам у Лідзе. Асобна змешчаны прысвячэнні ўжо даволі вядомых беларускіх паэтаў і творцаў рэгіянальнага значэння. Адны аўтары мелі адносіны да паэта-рэвалюцыянера пры жыцці, іншыя шануюць яго спадчыну і ведаюць тое мінулае, якое як рэхам адгукаецца ў час сённяшні. Разам з тым, пабыць у гасцях у Валянціна Таўлая, а менавіта ў лідскі перыяд яго пражывання, дапаможа чытачу змешчаная адна з версій серыйных інсцэніровак "У Таўлая пабываем… перад пачаткам вайны", падобныя якія праводзяцца ў мемарыяльным пакоі дома паэта па вуліцы Замкавая,7.

Творчасць Валянціна Таўлая - гэта яскравы прыклад адданасці свайму народу, і нам як спеў, як песню несці яе на хвалях памяці.

***Алесь Хітрун,***

*навуковы супрацоўнік Лідскага*
*гісторыка-мастацкага музея.*

# Песні кампазітара Леаніда Шурмана на вершы паэта Валянціна Таўлая і пра Валянціна Таўлая



***Валянцін Таўлай з жонкай Лідзіяй Сяргееўнай Казлоўскай, Мінск, 1946 г.***

# КАСТРЫЧНІЦКІ САЛЮТ

Муз. Л. Шурмана
Сл. В. Таўлая

Maestoso




-ты- я верхаві- ны Альп, гра- ні- ты звонка- га Па-
-мі- ра. Гры- міць кастрычніц- кі са- лют... Зда-
-ец- ца гэта гром Аў- ро- ры ус- ка-лыхнуў зда-
-лёк зям-лю і ззя- ю- чы спада- юць зо- ры. Гры-


-міць кас-трычні- ка са-лют здa- ец- ца гэта гром Аў-
-ро- ры ус- ка-лых-нуў зда- лёк зямлю і
ззя- ю- чы спада- юць зо- ры. Ле- нін, што
ўзняў над цэлым све- там Ле- нін!
rit.

## КАСТРЫЧНІЦКІ САЛЮТ

1. Пад гулкі, пераклічны залп,
Каторым салютуюць шчыра
Крутыя верхавіны Альп,
Граніты звонкага Паміра.

***Прыпеў:***
Грыміць кастрычніцкі салют...
Здаецца - гэта гром "Аўроры"
Ускалыхнуў здалёк зямлю,
І ззяючы спадаюць зоры.

2. Бары, як некалі, гудуць.
Зноў скібы чорныя пад плугам.
І дробяць гарнякі руду,
Шахцёры высякаюць вугаль.

***Прыпеў:***
І на стырне гадоў - рука,
Якая наша пакаленне
Вядзе з-пад самых барыкад,
Што ўзняў над цэлым светам Ленін.

# УСПАМІНЫ

Муз. Л. Шурмана
Сл. В. Таўлая




ба- чу я сцежкі і да- лі, - і- ду, а дзяўчына са
мно- ю і но- чы, я-кі- я вяс-но- ю на-
-скрозь салаўі прапя- я- лі, і но- чы я-кія вяс-
-но- ю на- скрозь салаўі прапя- я- лі.




## УСПАМІНЫ

1. Кожную ноч салавейка пяяў,
Зоры глядзелі у вочы.
Дзе ж ты сягоння, дзяўчына мая?
Дзе ж вы, шчаслівыя ночы?
Зноў бачу я сцежкі і далі, -
Іду, а дзяўчына са мною,
І ночы, якія вясною
Наскрозь салаўі прапяялі.

2. Змоўк салавей. Прамінуў светлы май.
Знікла і шчасце і воля
Краты мне свет засланілі. Бывай!..
Годзе, ўспаміны, даволі.
О!.. Гэта не рукі дзяўчыны, -
На нарах і душна, і цесна.
Хачу я пяшчоты і песні...
І песцяць мне сэрца ўспаміны.

# ХЛОПЦЫ

Муз. Л. Шурмана
Сл. В. Таўлая





-не пар- ты-зан- скі ла- гер.
Рас- шу- меў-ся цём-ны лес над маўклівым
ло- гам ходзяць хлопцы па ся- ле,
ходзяць па да- ро- гах.
1,2,3,4
Эй, гэй,




## ХЛОПЦЫ

1. Перадай, сасна, сасне -
Немцам будзе блага:
Не задрэмле, не засне
Партызанскі лагер.

Расшумеўся цёмны лес
Над маўклівым логам -
Ходзяць хлопцы па сяле,
Ходзяць па дарогах.

2. Сосны тут адна ў адну
Высяцца, як вежы, -
Не прайсці, не абмінуць
Немцу нашых сцежак.
Навакол бароў - палі,
А праз поле - сцежка.
Хочаш, фрыц, сяло спаліць -
Моцна апячэшся.

3. Ловіць фрыц гусей ля хат
Цягне фрыц падушкі -
Партызанскі аўтамат
Сочыць гнеўнай мушкай.
Як махне наш камандзір -
Немцаў - быццам здула.
Колькі немцаў - столькі дзір
І расходу ў кулях.

4. Кожны раз, калі бяда,
Хлопцы абароняць -
Будуць немцаў аглядаць
Чорныя вароны.
І на захад, і на ўсход
Ад Дняпра, ад Нёмна
Славіць хлопцаў наш народ,
Наша песня помніць.

# РАНАК ПЕРАМОГІ

**Муз. Л. Шурмана**
**Сл. В. Таўлая**




шэ- рых ру- ін, воб- лік свет- лы твой сні- лі на-
-ча- мі ў аст- ро- гах і ту- жы- лі ту- го- ю ма-
-гіл і кра- ін па та- бе, за- ла- та- я
вяс- на пе- ра- мо- гі на- шы
дрэ- вы, і квет-кі, і дзе- ці, і сны ле- ту-


-це- лі даў- но аб та- бе не- да- цве- там,- а ні-
ра- зу яш- чэ так па- кут- на вяс- ны не ча-
-каў ча- ла- век по- куль свет гэ- ты све- там.
1.2.3.
4



## РАНАК ПЕРАМОГІ

Мы цябе выглядалі з-за шэрых руін
Воблік светлы твой снілі начамі ў астрогах
І тужылі тугою магіл і краін
Па табе, залатая вясна перамогі.
Нашы дрэвы, і кветкі, і дзеці, і сны
Летуцелі даўно аб табе недацветам, -
Ані разу яшчэ так пакутна вясны
Не чакаў чалавек, покуль свет гэты светам.
Вочы дым выядаў, лісце вянула дрэў,
Апякалі зямлю і душу бліскавіцы.
Чорным полымем ранак вясновы гарэў,
Рассыпалася ў попел гарачы травіца.
І тады - успаміны халодным асцём,
Як запалы нянавісці, ўпіліся ў сэрца, -
Кожны кінуцца мог за Радзімы жыццё
І ўзарвацца гранатай пад крокамі смерці.
Выбухалі і песні, і сэрцы, як тол.
Смерць, губляючы косці, назад адпаўзала
Праз магілы ахвярныя нашых братоў,
Праз руін гарадоў, цені сёл і вакзалаў.
Мы, як гнеў, неадступныя, следам ішлі,
Задыхаліся ў ярасных бітвах, пагонях, -
І астаўся за намі дым родных сяліб,
І вайной узараныя родныя гоні.
Чорным саванам клалася злая зямля,
Што ў пяшчэрах сваіх смерць таіла спрадвеку
І атрутай паіла калоссе ў палях,
А нянавісць радзіла, як хлеб, чалавеку.

Праклялі яе нашы гарматы наскрозь -
Ад Мазурскіх азёр да самога Берліна,
Покуль сонечным ранкам, няўмольным, як лёс,
Не ўвайшла наша помста на Унтэр-дэр-Ліндэн.
Кожны з нас тады лёгка. глыбока ўздыхнуў.
Задзівіліся ўсе: ціхі гэтакі ранак...
І пазналі яе, залатую вясну,
Аж занылі ад радасці даўнія раны.

# АДДАЮ ШЧЫРЫ ГОЛАС САЛДАЦКІ

**Музыка Л. Шурмана**
**Сл. В. Таўлая**




-гон- ня... я ў ба-ях пасі-веў ма- ла- дым: можа
по- пел мне скро-ні а- сы- паў, калі я штурмаваў га- ра-
1, 2
-ды, а мо пе- най а- пыр-ска-ла Прыпяць.
3
-дац- кі адда- ю шчыры го- лас сал-дац- кі.
rit.

## АДДАЮ ШЧЫРЫ ГОЛАС САЛДАЦКІ

1. Я дарос, пасталеў на вайне,
І хоць свеціцца срэбра на скронях,
Дзядькам клічаш дарма ты мяне, -
Першы раз галасую сягоння...
Я ў баях пасівеў маладым:
Можа, попел мне скроні асыпаў,
Калі я штурмаваў гарады,
А мо пенай апырскала Прыпяць.

2. Нахадзіўся і я за вайну,
І вярнуўся з паходу учора,
І слязу першы раз праглынуў,
Неба роднага ўбычыўшы зоры...
Дай, таварыш і мне бюлетэнь:
Калі хоча Радзіма спытацца,
Я ў сягоняшні радасны дзень
Адкажу дарагой па-салдацку.

3. Прысягаю на попел руін
І на нашу вялікую справу, -
Не знайшоў ласкавей я краін,
А ні больш чалавечага права.
Толькі наша Радзіма знайшла
Сцежку кожнаму, кожнаму - працу.
За разумны, савецкі наш лад
Аддаю шчыры голас салдацкі.

# ПЕРШАМАЙСКІЯ СЦЯГІ

Муз. Л.Шурмана
Сл. В. Таўлая




-май- скія сця- гі па- лош- ча зо- лак зала-тіс- тай хваляй!
Ця- пер я- ны, як ду- жы- я ар- лы, на
вет-ры буйным рас-пас-цер-лі крыл- лі, а не-ка- лі ж мы іх, як
ар- ля- нят малых, ту- лі- лі к сэр- цу і ўзлятаць ву- чы-лі. А



23
не-калі ж мы іх, як ар-ля- нят малых, ту- лі- лі к сэр-цу і ўзля-
26
-таць ву- чы- лі.
шчы- ра хо- чаш!
29
32

## ПЕРШАМАЙСКІЯ СЦЯГІ

1. Прачніся досвіткам, таварыш дарагі, -
Калісьці ў ноч такую мы не спалі...
Паглянь, як нашы першамайскія сцягі
Палошча золак залацістай хваляй!
Цяпер яны, як дужыя арлы,
На ветры буйным распасцерлі крыллі,
А некалі ж мы іх, як арлянят малых
Тулілі к сэрцу і ўзлятаць вучылі.
А некалі ж мы іх, як арлянят малых
Тулілі к сэрцу і ўзлятаці вучылі.

2. І нас тапталі часта - часта капыты -
Скажы, таварыш, хто палічыць паўшых?
А боль, павер, не меншы быў па тых...
Па тых правадырах чырвонакрылых нашых.
І сёння, бачыш, распасцёртыя плывуць -
Увесь збалелы свет абняць ахвочы.
Трымай жа вострым штык і ўзнятай галаву,
Калі сцягам палёту шчыра хочаш!
Трымай жа вострым штык і ўзнятай галаву,
Калі сцягам палёту шчыра хочаш!

# КАМЕНЬ ЗА КАМЕНЕМ

**Муз. Л. Шурмана**
**Сл. В.Таўлая**




но-ва- га дня! Яс- на- я сце- жач-ка шчасця пралег- ла
ін- ша- е сцеж- кі да шчасця ня- ма. Ка-мень за ка- ме- нем,
цэг- ла за цэглай зло-жым, як пес-ню бу- ды- ні- ну- гмах.
Камень за ка- ме- нем, цэг-ла за цэг-лай зложым,як пес- ню бу-




## КАМЕНЬ ЗА КАМЕНЕМ

1. На рыштаванне гісторыя кліча:
Гэй, узнімайся хутчэй, маладняк,
Новага ладу тварцом-будаўнічым
Выйдзі на досвітку новага дня!
Ясная сцежка да шчасця пралегла,
Іншае сцежкі да шчасця няма.
Камень за каменем, цэгла за цэглай...
Зложым, як песню, будыніну-гмах.

2. Цэментам, сталлю часцінкі злучаем,
Сцены растуць, узнімаюцца ўверх.
Чорныя сілы знямелі ў адчаі, -
Ім не стрымаць будаўніцтва, павер!
Камень за каменем, цэгла за цэглай...
Гэй, хто стрымае наш творчы размах?
Слава сябрам - будаўнічым, што леглі
Шэрымі цэгламі ў велічны гмах!

# Яго напевам выпаў слаўны лёс
# (памяці тав. Таўлая)

Муз. Л.Шурмана
Сл. М.Танка

Moderato con moto




13
-пе- вам вы-паў слаўны лёс на- батным звонам пра- гу- чаць над
16
кра- ем прай- сці шля-хі э- та- паў і бя- роз, су-
19
-стрэць сва- боду свет-лы золак ма- я. смер- ця на
1
2
22
вар-це стойце славы і бяс-смер- ця.

*Максім Танк*

## ЯГО НАПЕВАМ ВЫПАЎ СЛАЎНЫ ЛЁС (ПАМЯЦІ ТАВ. ТАЎЛАЯ) (урывак)

1. Яго напевам выпаў слаўны лёс:
Набатным звонам прагучаць над краем,
Прайсці шляхі этапаў і бяроз,
Сустрэць свабоду - светлы золак мая.

2. І сёння вы, каго паэт любіў,
З кім разам жыў, у смерць яго не верце!
Калі на час ён зморaны спачыў. -
На варце стойце славы і бяссмерця!

# Вершы Валянціна Таўлая, напісаныя ў Лідзе



***Валянцін Таўлай у вольны час. Ліда, 1941 г.***

## WROBELKI

Zima sroga. Mróz aż strzela.
Żadnych ptaków niema u nas.
Tylko wrony i wróbelki.
Biedne, biedne te wróbelki –
Nie mają co jeść.
Skaczą chlodne, skaczą glodne,
Ale cóż poradzić –
Wnet przeminie sroga zima.
Przyjdzie wiosna – i nakarmi.

*г. Ліда, 1923 г.*

## ВЕРАБЕЙКІ

Ну й зіма! Трашчаць марозы
І няма ніякіх птушак -
Толькі вераб'і, вароны.
Горка гэтым верабейкам
З думкай аб ядзе
Так падскаківаць галодным.
Але што ж мы зробім? -
Вось міне зіма цяжкая.
І вясна прыйдзе, накорміць.

*г.Ліда, 1923 г.*

## РЭДАКЦЫЯ Ў ШАПЦЫ

І зімой і ўлетку
трэба нам газетка
бойкая, зубатая -
хто ж будзе рэдактарам?
Цэлым сходам думалі
і такі надумалі:

Вось Кастусь Шулейка,
тонкі, як жалейка,
ходзіць самапасам
п'е гарэлку з квасам,
вершамі кудахтае -
выбралі рэдактарам.

Ходзіць наш рэдактар
ў шапцы, ў рагатай:
- Вось у гэтай шапцы я
ўсю нашу рэдакцыю.

Папрасілі - шапку зняў:
рот раззявіўся ў раззяў:
з шапкі ад спалоху
выскачылі блохі.
Налічылі дзесяць блох -
больш нічога не было:

Чыста, як падмецена.
Вось вам і газеціна!

______

Таварыш калгаснік, запомні гэта:
які рэдактар - такая газета.

*Калгас імя Леніна,*
*сакавік 1941 г.*

## МАЛОЙ СЯСТРЫЧЦЫ

Пакуль, сястрычка, падрасцеш
І шлях пратопчаш свой жыццёвы, -
На памяць вывуч гэты верш,
Які складаю шчырым словам.

Не зразумееш мо мяне -
Пішу табе яго навырасt,
Я знаю: гэты дзень міне,
З якога верш сягоння вырас.

Магчыма, толькі ён адзін
І астанецца жыць на памяць,
Як рэха дальняе гадзін,
Што сэрца мне гнятуць і раняць.

Тады, сястрычка, ўспамяні
Усіх, хто з бою не вярнуўся,
Каб намі высненыя дні
Зноў паплылі над Беларуссю.

*г. Ліда, 23.02.1943 г.*

## ДЗЯЎЧЫНКА-СВІНКА

*Я Ніночку-малышу*
*Гэткі вершык напішу.*

Ёсць на свеце дзяўчаткі ўсялякія:
Ёсць надутыя і пустыя:
І не знаеш - смяяцца ці плакаць
Над такою, што вечна ные.

Ёй са сну - аж вочы папухлі,
Ад ляжання - бакі забалелі.
А яна выбірае туфлі
З маміных рук у пасцелі.

Перабраўшы разоў можа з дзесяць
Туфлі, валёнкі, чаравікі,
Ногі ўрэшце з пасцелі ўзвесіць -
Аб істужках бярэцца хныкаць

Мо' ружовую? Жоўтую можа?
Мо' блакітную ў косы ўплесці?
Мама, - косы часаць паможаш?
Ну, а мама… паклікала есці!

- Есці? Фэ!.. Не хачу зусім я!..
- Еш, дачушка, збірайся ў школу.
- Мне баліць галава і шыя
І ў баку трохі вельмі коле…

Ну, Нінок, ці ж гэта дзяўчынка? -
Адкажы, як хочаш, як знаеш,
Бо па-моему - гэта свінка,
Можа, нават і немалая.

Лепей змалку ўставаць раніцою,
Адзявацца самой, абувацца.
Мыцца ўпояс халоднай вадою
І наеўшыся - ў школу спяшацца.

*г. Ліда, 23.02.1943 г.*

***

Гэта ўсё - знаёмыя шляхі.
Аглянешся - затанулі ўдалеч.
На адных - палын расце глухі,
На другія - зоры ападаюць.

Пры юнацтве, што здалёк звініць,
І арлы садзіліся ахвоча,
Часам - каб да лёту заманіць,
Часам - каб выдзёўбваць вочы.

Але мы, улюбіўшыся насмерць
У шляхі, пракладзеныя ў заўтра,
Навучылі песню разумець,
Што ў змаганні і загінуць варта.

Вокам на шляхі куды ні кінь,-
Тлеюць косці звестуноў прадвесня
І ляжаць жалобныя вянкі
Анямелых з болю верных песень.

Не даклічацца ніякая вясна, -
Голас расплывецца ў чыстым полі,

Не збудзіўшы стомленнага сна
Змагароў, загінуўшых за волю.

Але хай высокі маладняк
Боль магіл кране карэннем шчырым, -
І насустрач заўтрашняга дня
Нашы песні зазвіняць з-пад жвіру.

*г. Ліда, 1941 г.*

## ПЕРШАМАЙСКІЯ СЦЯГІ

Прачніся досвіткам, таварыш дарагі, -
Калісьці ў ноч такую мы не спалі...
Паглянь, як нашы першамайскія сцягі
Палошча золак залацістай хваляй!

Цяпер яны, як дужыя арлы,
На ветры буйным распасцёрлі крыллі,
А некалі ж мы іх, як арлянят малых,
Тулілі к сэрцу і ўзлятаць вучылі.

За пазухаю несліў тую ноч
Да абступіўшых шлях бяроз высокіх
І узнімалі ўверх на знойдзенай даўно
Вяршыні стромкай - мачце адзінокай.

Мы ведалі: варожая рука
Яго за крылле сцягне ў злосці дзікай,
Але не спыніць ўзмаху, што склікаў
З прасёлачных дарог на шлях вялікі.

І нас тапталі часта капыты -
Скажы, таварыш, хто палічыць паўшых?
А боль, павер, не меншы быў па тых
Правадырах чырванакрылых нашых.

І ў верасах датлелі дні тугі,
Мы, як зару, свабодны сцяг узнялі.
З палону выйшлі хлопцы і сцягі,
Якіх даўно вятры не цалавалі.

І сёння, бачыш, распасцёртыя плывуць -
Увесь збалелы свет яны абняць ахвочы.
Трымай жа вострым штык і ўзнятай галаву,
Калі сцягам палёту шчыра хочаш!

*Ліда, 30 красавіка 1941 г.*

## АБ МАІХ ВЕРШАХ

Маякоўскі па-сяброўску радзіў
не збываць адразу верша з рук:
напісаў - замкні яго ў шуфлядзе,
як адлежыцца, - судзі, здавай у друк.

Не забыцца добрае парады,
колькі мог, і пан мне "дапамог",
замыкаючы замест шуфляды
з вершамі - і аўтара ў астрог.

Праўда, іх судзілі, - не затоіш,-
і шпікі, якога ні вазьмі,
кожны прысягнуў на крыж за тое,
што не вершы гэта - дынаміт.

Пракурор праз кодэкса артыкул
углядаўся ў кожны мой радок,
нават пальцам асцярожна тыкаў
і ацэньваў: за радок - гадок.

Адсылаў ізноў ляжаць на нары,
шліфаваць і вершы і бакі,
і аб друку час ад часу марыць:
жыў на свеце Скарына такі…

Наляжаліся - аж скабы забалелі
вершам, аўтару, народу-чытачу.
Вершы многія ад гэтага ссівелі,
многіх - і зусім не далічу…

Толькі аднаго адкінуць нельга:
шліфаваў радок, як сталь звяна;

ланцугі тады на мне звінелі, -
можа й вершы ад таго звіняць.

*Ліда, 7 чэрвеня 1941 г.*

## ЛІСТЫ З ТУРМЫ

I

Ужо ў зары наступны наш этап.
Калі сустрэнем, скажам так Максіму:
Ніякі чорт нам душ не растаптаў,
І мы на рынак вершаў не насілі.

II

Сябры мае, Пілiпе і Максіме,
Пішу, здаецца, развітальны ліст.
А шкода: перазімаваўшы зіму,
І да сустрэчы, можа б, дажылі...

Ды сцежка ўблыталася ў дрот калючы,
А ў сэрца - накірован аўтамат.
І думкі сцяліся ў камок балючы,
І ўсё цяжэй душу гняце турма.

І вось пішу на poste restente далёкі
Да вас, сябры этапаў і дарог.
На памяць пакідаю рэха крокаў,
Якое ў вершах некалі збярог.

Няхай жа вершы астануцца свету -
Сіроты беспрытульныя мае,
Хоць нават ім, каб перажыць паэта,
Ні фарбы, ні паперы не стае.

Але не ўсё навек развеяў сівер
Па тых шляхах, якімі я ішоў,
І песня не адна, запаўшы ў сэрца ніве,
Вясною ранняй зазвініць ізноў.

Вазьміце ў спадчыну астатак гэты -
Ён вашым песням, знаю, не чужы -
І не забудзьце звонкім запаветам
На струны Беларусі палажыць.

Бывайце, хлопцы! Нашы гоняць немцаў.
Ужо над Прыпяццю і песні і сцягі:
Калі зямля пад танкамі ўздрыгнецца -
Мы ўчуем нават праз пясок магіл.

III

Я дажываю восеньскія дні,
Пакуль навекі восень заварожыць,
Хачу, каб мы сустрэліся адны,
Як двое зродненых пуцінай падарожных.

Спазніцца нельга, нам даўно пара:
Чакае нас, знікаючы, пуціна.
Лісты на клёнах скора дагараць,
Асыплюцца пажоўклыя хваіны...

І толькі мне ў няволі без пары
Не хочацца ні дагараць, ні гаснуць
Насустрач палымнеючай зары,
Насустрач дням і велічным і ясным.

Каму я вочы перадам свае
І сэрца, што астынуць не паспела?
Няма дачушкі роднае мае -
Не адрадзіцца мне ў маленькім целе.

І не расці і не глядзець на свет
Праменнем вачанятак шэрых...
Таму адной табе, як запавет,
Пакіну спадчыну тугі і веры.

Ў жыццё, што будзе вечна зелянець,
Як дрэва стройнае і маладое, -
І ад карэння па лістоў павець
Яго атрутай рабства не напояць!

*Ліда, турма, 23 верасня 1943 г.*

## СОН ГІТЛЕРА

Хочаце - верце,
А хочаце - не:
Раз Гітлеру чэрці
Прысніліся ў сне.
Ён зводку пісаў
І заснуў неўпрыцям -
І дзівіцца сам
Нечаканым гасцям.
Налева, направа
Махаюць хвасты...
- Ну, фюрар, як справы
І як там франты?"
- Ах, сам я ў адчаі
І паніка ў штабе -
Франты скарачаю
У вялікім маштабе".
Якой жа халеры
Заводзіў у блуд? -
На'т чэрці не вераць
Табе, шалапут.
Прабрэшаш, праплешчаш
Берлін, галаву,
А ў пекле нарэшце
Язык адарвуць!"
І Гітлер прачнуўся
І выцер свой лоб:
- Згінь мара!.. Зноў мусіць
Над зводкай захроп...

*Лідская турма,*
*верасень 1943 г.*

***

Дзе ж ты, мілая*? Нашто было нам
Сцежкі родныя асірачаць.
На балючым і крутым заломе
Ставіць развітальную пячаць?
Дзе табе дванаццаць з веж прабілі
І калі удар апошні змоўк?
У якой няведамай магіле
Вочы, згасшы, дзівяцца ў пясок?
Па табе сумую, дружа родны,
Дзе той залп, які свінцом шугнуў
І зваліў цябе на жвір халодны -
Без мяне - маленькую, адну.
Не змагу і так я, дарагая,
На зямлі здзічэла век дажыць, -
Хай душа агнём апошнім дагарае,
Гэты свет - бязлітасны чужы...
Нам яго ўзарваць або загінуць,
Але сцежкаю ісці б адной

Ах, чаму не легчы разам за краіну
На магілы брацкай тое ж дно?
Я тады б упаў табе на грудзі,
Утуліўшы спазм свае любві
У сон, якога залпы не разбудзяць
Ні гарачай капанне крыві…

*20.10.1941 г.*

*Верш прысвечаны Кіры Брандт - першай жонцы паэта.

Акрамя гэтых вершаў, у Лідзе быў пакладзены пачатак напісанню паэмаў "Песня пра сухар", "Таварыш", “Кобрыншчына”, пра Палессе і інш.

# Прысвячэнні Валянціну Таўлаю



***Валянцін Таўлай, Уладзімір Урбановіч і Максім Танк, Вільня, 1945 г.***

*Максім ТАНК*

## ПАМЯЦІ ТАВАРЫША ТАЎЛАЯ

Была такая слота-непагода,
Што нават сышчык, затуліўшы твар,
Свой пост пакінуў каля брам завода,
Паплёўся грэцца у бліжэйшы бар.

Як лісце, вецер вымеў багамольцаў
З парталаў Вострай Брамы і Пятра.
Глухая, беспрасветная пара,
Калі гадамі не ўставала сонца!

І вось у гэткі час у мой пакой
Прыйшоў таварыш, звольнены з астрога,
Таўлая вершы ён прынёс з сабой,
Зашытыя ў вопратцы убогай.

Ля сэрца ён хаваў іх і бярог,
Каб не знайшлі, не адабралі каты,
Не кінулі слоў вольных у астрог,
Пятлёй не задушылі ў казематах.

Не для таго зняволены паэт
Пісаў іх. Сам ён гаварыў заўсёды,
Што песням час ісці ў шырокі свет,
Сцягі ўздымаць і калыхаць паходы.

І мы іх перапісвалі ўсю ноч,
Калі ж прыйшоў пад вокны ранак хмарны, -
У непагоду, у асенні дождж
Аднеслі іх ў падпольную друкарню.

Яго напевам выпаў слаўны лёс:
Набатным звонам прагучаць над краем,
Прайсці шляхі этапаў і бяроз,
Сустрэць свабоду - светлы золак мая.

І сёння вы, каго паэт любіў,
З кім разам жыў, у смерць яго не верце!

Калі на час ён змораны спачыў, -
На варце стойце славы і бяссмерця!

*11.V.1947 г.*

## АПОШНЯЕ ПЫТАННЕ

*Памяці В.Таўлая*

Раніца. Чорт бы пабраў
Такі тэлефонны званок!
Трамвай разбітым горадам
Ледзь цягнецца
да бальніцы,
Дзе кожную хвіліну
Можа пагаснуць зрок
І сэрца паэта, зморанае,
Спыніцца.

Нехта перад палатай
Не мог утрымацца -
заплакаў.
Нехта кветкі прынёс,
Якіх так не хапала ў жыцці,
Белыя, як маскіровачныя халаты.
Нібы ў атаку
Праз міннае поле
Збіраемся ўсе мы ісці.

Раптам бачым - усмешка,
Незакончаны ліст у руках…
- Ну, вось і сустрэлася
Наша сям'я баявая!
Учора, неспадзявана,
Званілі з ЦК,
Пыталіся, можа, што трэба
І як я сябе адчуваю.

Вось толькі хай стану на ногі -
За працу вазьмуся адразу.
О, колькі яшчэ чакае
Не пройдзеных намі дарог!
Толькі чаму вы сягоння
Сышліся,
таварышы,
разам?..
І з нас на гэта пытанне
Ніхто адказаць
не змог.

*3.IV.1967 г.*

***Мікола АРОЧКА***

## КУРТКА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ

*Лідзіі Сяргееўне Таўлай*

Гасла "буржуйка"… Вецер
Цёрся аб мокры вугал.
Стрэліўшы, з чорных дзверцаў
Выпаў гарачы вугаль - і раскалоўся…

Пырснулі сполахі зайкамі
Па анямелым закутку,
Скочылі жоўтымі лапкамі
На патрапаную куртку - і расплыліся…

Жанчына рукою млеючай
Куртку з цвіка здымала
І, як крывінку-малечу,
Да грудзей прыціскала, цалуючы…

Куртка дыхнула спатканнямі,
Кратамі, пылам, потам,
Лістамі неадасланымі
З-за калючага дроту… і ростанню!

У кішэні - тры хлебныя карткі,
Пажоўклыя, нескарыстаныя,
Ды шчопці сухіх зярняткаў
З коласа, пэўна, сарванага на родным полі!..

Паклала на стол ціхутка,
Далонямі распрастала
І спрысквала тую куртку
Не вадою, калі прасавала, - слязою гаручай…

Сатлела вуголле… З печкі
Ёй падгалошваў вецер…
Ён надзеў сваю куртку на плечы
І з хаты пайшоў - у бяссмерце.
*1971 г.*

## КАЛЯ ВЯЛІКАЙ КРАКОТКІ

*Памяці Валянціна Таўлая*

Сюды, на ўлонне бароў і палян,
Калісь прыязджаў з-за паўсвета
Красой любавацца вяльможны пан
І нават папісваў санеты.

Пісаў, што ў галінках шчабечуць яму
Пра вечнае шчасце сініцы,
Што ўсю прахалоду яму аднаму
Прыносяць лясныя крыніцы…

А той, хто з маленства у гэтым гаю
І з хвояй, і з песняй здружыўся,
У тую часіну быў рад вераб'ю,
Што часам ля кратаў садзіўся!

Крыніцы мне бачыць - хіба толькі ў сне,
Далёка ад сосен кашлатых.
І з думкай пра іх, пра цябе, пра мяне
Радком пілаваў ён краты.

І, пэўна, таму яшчэ з даўняй пары
Люблю я так гэтае месца -
Усё: ад птушынае песні ўгары
Да шышкі калючай на сцежцы!

*1956 г.*

## ВЯЛІКАЯ КРАКОТКА

Мой цэлы свет: Вялікая Кракотка,
Часоў бурлівых родны мацярык.
Была Кракотка,
як рака ў паводку.
Была Кракотка, гнеў, і боль, і крык!

Кракотка - гэта хвойны пах узлесся,
Гняздо за пазухай зялёных гор.
З таго гнязда заклекатала песня,
Што клікала з нізіны:
"Гэй, да зор!"

Рашаўся лёс…
Прадвесне гнала крыгі.
І вось тады з твайго мацерыка
Дрыготка пацягнулася да кнігі
Мазольная сялянская рука.

Святая прага ведаў і пазнання!
У родным слове чалавек ажыў.
Было тут вашай еднасцю змаганне.
А духам мужнасці - Купала быў.

Хто знае, колькі іх, натхнёна-ўпартых,
Адсюль паклікаў наш змагарны край?
Недарам верш, якім пілуюць краты,
З зямлі вось гэтай здабываў Таўлай!

Нязломны дух…
Жывая сіла мовы.
Жыву з тых дзён я вашаю красой.
Жыткевічы… Збраевіч… Трафімовіч…
Ля вас я грэўся словам і душой.

Я ўдзячны вашаму агню і хлебу.
Рукам, што уздымаюць торф, падзол,
І спорна сеюць зерні веры ў глебу,
І лустай праўды асвячаюць стол.

Мой родны свет:
Я ў кожнай тут часцінцы
Жыву - дзялю і радасць і слязу.
І ўсё, чым з каранёў тут прычасціўся,
Нясу ашчадна, як зямлі красу.

## СУСТРЭЧА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ З ЯНКАМ КУПАЛАМ

Таўлай спыніўся ля прысад.
Таполя-вежа…
Дзверы ў дом Купалы.
Ён вырваўся з-пад допытаў і крат,
Ён зведаў дзве турмы…
Ды не хапала
Адвагі тут - пераступіць парог…

А думаў -
Толькі з-за дратоў прарвецца
У вольны Мінск, пакінуўшы астрог,

Ён прынясе з этапаў і дарог
Купалу сваё зраненае сэрца…

А думаў -
Набалела прыпадзе
У споведзі да чуйных рук паэта,-
І крык муроў,
І цяжкі шторм падзей
Ён данясе найперш да клямкі гэтай…

Чаго ж спыніўся, юны пасланец?
Ты чуеш - разліваюцца па целе
Радкі, што упіліся, як свінец,
У тваёй камеры былой - у цэглу:

"За свабоду сваю
Ўсёй душой пастаю;
У агонь, у ваду
Я за ёю пайду…"

Дапытвалі вадою і агнём.
І вось, апалены,
Шаснаццацігадовы,
Прыціхлы пад таполевым галлём,
Стаіш разгублена, шукаеш словы…

Ды нечакана - голас у дзвярах:
- Заходзьце!
- Добры дзень, Купала!..

Ці раз барацьбітоў
Па вопыт песняра
Сюды эпоха пасылала!

## ПЕРАД ЦЕНЕМ ТАЎЛАЯ

Няхай твой цень ахоўвае мяне
Ад усяго, што ты хапіў замнога,
Ад здзеку, глуму, насміхання злога
Няхай твой цень ахоўвае мяне.

Ад ношы непасільнай на спіне,
Што горбіць, гне,
Трымае ў паніжэнні,
Ад кроку тога, за якім падзенне,
Няхай твой цень ахоўвае мяне.
Ад пядзі неба у сляпым акне,
Ад летуценняў-дум закратаваных,
Ад песні, што на вуснах абарвана,
Няхай твой цень ахоўвае мяне.
На сцежцы твайго духу
Хай міне
Мяне у новым часе
Твая чаша.
Хоць ведаю, што тая ж справа наша
Мне кроплю недапітую на дне
Яшчэ пакінула… Твой цень мяне
Няхай ахоўвае…
Ці пракляне!

*

Бянтэжылі не цені крат,
Не цвіль і стогн крывавай цэглы.
Ты аддаваў ім зноў
На гвалт,
На глум заўчасны сваё цела.

А лёс закратны слова, вершаў
Бянтэжыў…
Нематліва пёк.
Хоць галавы сваёй не вешаў,
Ды плакаў, як хлапчо, радок.

А гэта, брат, цяжэй нашмат,
Калі няма яму падмогі
Калі у свет,
Да родных хат
Закратаваны ўсе дарогі.

Бо дух тады, лічы, памершы,
Задушаны ў тваіх руках.

Калі яму да родных межаў
Замураваны глуха шлях…

Бянтэжылі не цені крат,
А лёс закратны слова, вершаў,
А гэта, брат, цяжэй нашмат,
Бо дух тады, лічы, памершы.

*Анатоль ІВЕРС*

## ЗВІНЕЦЬ КРЫШТАЛЬНЫМ ТВАІМ ВЕРШАМ

І шумець нашым сцягам вякі.
І звінець крыштальным тваім вершам.
Ты іх нёс дарогай, напрасткі,
Ды ў паходзе быў заўсёды першым…

Не забудзем баявы Мадрыд.
Аб якім ты сніў на цвёрдых нарах.
Часта нёс байцам ваду ў вядры,
Што далі крыніцы нашы, Нарач.

Не забудзем радаснай пары,
Як зямля скранулася з арбіты.
Вераснёвым ранкам свой парыў
Кінуў ты ў бязлітасную бітву.

Успомнім тых, каго між нас няма,
Хто загінуў, ды не здрадзіў справе.
Будзем вечна славіць Першамай
І Кастрычнік вечна будзем славіць.
*1957 г.*

* * *

Ты любіў такое хараство,
Каб жыццё кіпела ў родных хатах.
Бачыў часам неба ты праз ствол
Баявога друга аўтамата.

Сцягу нашаму шумець вякі
І звінець тваім крыштальным вершам,
Бо праносіў сцяг ты напрасткі,
У паходзе быў заўсёды першым.

Зноў гарыць у памяці Мадрыд,
Аб якім ты сніў тады на нарах…
Шчасце стрэўшы, плакалі наўзрыд
Вераснёўскім ранкам Буг і Нарач.

Успомнім тых, каго між нас няма,
Хто загінуў, ды не страціў справе.
Будзем вечна славіць Першамай
І Кастрычнік вечна будзем славіць.

*1967 г.*

## БЕЛАРУСЬ - ЯГО РАДЗІМА

*Памяці В. Таўлая*

… І наш сцяг, што рваўся ўвысь,
Светлым Першамаем,
Дасягнуў да сінявы -
Ў космасе лунае.

Мірны голас зазвінеў
Моцна, як ніколі,
Значыць, радасць не міне
Людзей добрай волі.

Колькі год у поўны рост
Па зямлі мы крочым!
Плуг, і молат, і пяро -
У руках рабочых!

Не прайдзе бандыт-фашыст
Па радзімай карце.
Калі хочаш - верш пішы,
Не запруць у карцэр.

Толькі дзе ты, дарагі?
Кажуць сёння ў Лідзе.
Вернецца праз дзень-другі,
Як газета выйдзе.

Мо ў Баранавічах ён
Дзесь прысеў на ўслоне?
Можа сеў ужо ў вагон
І спяшыць у Слонім?

Не шукайце, Беларусь -
Вось яго радзіма.
Поруч з кнігай
З добрых рук
Ходзіць яго імя.

*8 лютага 1984 г.*

*Ніна ТАРАС*

## ПАМЯЦІ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ

*- Я чакаць… не магу, таварыш…*
*Там сцякаюць крывёй сябры…*
*Дазваляй… сакратар, мне… адразу…*
*На іспанскі фронт… у Мадрыд…*
*Валянцін Таўлай. "Таварыш".*

Калі па звычцы прывядзе сама
У дом твой сцежка, ціха рыпнуць дзверы,
Мне скажа ўсё, што ўжо цябе няма.
Цябе няма…
А я ўсё не веру.

Тут цішыня натхнёных дзён рабочых,
А ты ж прывыкнуць да цішы не мог…
І здасца - зноў адважна ўдалеч крочыш,
Туды, дзе шмат падпольных ёсць дарог.

І здасца - зноў, забытага ў марах,
Турма цябе няволіць, як і перш,
У камеры, схіліўшыся на нарах,
Ты пішаш зноў пра камунара верш.

Пануры цень кладуць на сцены краты,
А боль у грудзях зноў пачне гарэць…
А дзесьці рэвалюцыі салдаты
Стаяць за праўду на жыццё і смерць.

Ды кашаль абрывае строфы верша,
І падаеш, знясілены, ля нар…
А дзесь на штурм адважна мчыцца першы,
Узняўшы сцяг высока, камунар.

Як хораша аддаць жыццё за волю
Працоўных мас… І шэпчаш, нібы ў сне:
"Прашу… таварыш сакратар… дазволіць…
На край пярэдні сёння… і мяне…".

## ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ

*Помню, помню, мы некалі*
*дзікую ружу сустрэлі*
*І не ведалі, ружа цвіла*
*ці сустрэча і вочы цвілі.*
*Валянцін Таўлай.*

Дзікая ружа! Пялёсткі засохлі, завялі.
Годы прайшлі, а боль у душы не пагас…
З новымі песнямі крочым мы ў новыя далі.
І як жа аднак цябе нехапае між нас!

Дружа бунтарны, снішся мне часта-часта -
То ў Афрыцы краты пілуеш, то мчышся ў бой…
А я затужыла… Самотнай парою не раз так
Іду на спатканне і гутару ціха з табой.

Каменная глыба ляжыць па каменнаму змрочна,
І надпіс халодны… Навошта ўсё гэта мне?
Няўжо я забыла імя тваё, песню, што крочыць
Па вольнай краіне, па нашай праменнай вясне?

Квітнеюць таполі, каткі ападаюць на рукі,
І галкі свой клёкат разносяць, відаць, на дажджы.
І дзесьці далёка чуваць экскаватара грукат -
Які ён цудоўны стаў, Мінск наш! А ты не дажыў…

Помніш, мы марылі? Многа было ў нас мараў:
Аб новых песнях, аб калектыўнай сяўбе,
Марылі бачыць мы зорнае неба без хмараў,
Толькі чамусьці заўжды забывалі сябе.

Нам не хапала на гэта хвіліны натхнёнай, -
У час, калі справы народа бурлілі ракой,
Сорамна неяк, здавалася, думаць пра хлеб штодзённы,
Пра ўтульнасць думаць і пра душэўны спакой.

Мары збываюцца - глянь, як яна расцвітае,
Наша Айчына, колькі уранку красы! -

На спелай ніве сонца спякотнае тае:
Па сонцу маленькаму - ў кропельцы кожнай расы.

Помніш, як сэрца ад шчасця тваё трапятала,
Калі першамайскі свой сцяг ты ўзнімаў на зары?
А тая бяроза - якая цяпер яна стала,
Як горда трымае вяршыню сваю угары!

О, гэты сцяг наш, як жа ён бачны здалёку! -
Яго ўзнялі ўжо свабоднае Кубы сыны.
Ідуць афрыканцы ў змаганні мільённым крокам, -
Чуеш - няволі апошняй трашчаць кайданы?

А сцяг развяваецца вышай і вышай над светам, -
Як хоча ён людзям прастору і болей цяпла!..
А толькі вось песні свае даспяваць не паспеў ты,
Каб разам са сцягам да камунізма плыла.

*Мінск, 19.II.1964 г.*

## ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ
### (другі варыянт)

*Помню, помню, мы некалі*
*дзікую ружу сустрэлі*
*І не ведалі, ружа цвіла*
*ці сустрэча і вочы цвілі.*

*Валянцін Таўлай.*

Дзікая ружа! Пялёсткі засохлі, завялі.
Годы прайшлі, а боль у душы не пагас…
З новымі песнямі крочым мы ў новыя далі.
Чаму ж не хапае сягоння цябе паміж нас?

Дружа бунтарны, ты снішся мне часта-часта -
То ў Афрыцы краты пілуеш, то мчышся ў бой…
А я затужыла… Самотнай парою не раз так
Іду на спатканне і гутару ціха з табой.

Каменная глыба ляжыць па каменнаму змрочна,
І надпіс халодны… Навошта ўсё гэта мне?

Няўжо я забыла імя тваё, песню, што крочыць
Па вольнай краіне, па нашай праменнай вясне?

Помніш, мы марылі? Многа было ў нас мараў:
Аб новых песнях, аб калектыўнай сяўбе,
Марылі бачыць мы зорнае неба без хмараў,
Толькі чамусьці заўжды забывалі сябе.

Нам не хапала на гэта хвіліны надхнёнай.
У час, калі справы народа бурлілі ракой,
Сорамна неяк, здавалася, думаць пра хлеб надзённы,
Пра ўтульнасць думаць і пра душэўны спакой.

Помніш, як сэрца ад шчасця тваё трапятала,
Калі першамайскі ты сцяг узнімаў на зары?
А тая бяроза - якою цяпер яна стала? -
Сама, нібы сцяг, расшумелася горда ўгары.

О гэты наш сцяг, як жа ён бачны здалёку!
Яго ўзнялі ўжо свабоднае Кубы сыны.
Ідуць афрыканцы сваім пераможным крокам.
Чуеш - нявол і апошняй трашчаць кайданы?

А я па прывычцы яшчэ ўсё збіраю газеты
І кожную вестку ўсё для цябе берагу.
Як дзіўна, сапраўды, - каторае гэта ўжо лета?
Спачатку здавалася - роста вось так не змагу…

Прабач, не хацела аб гэтым… Захмурыла ўвысі…
Ты знаеш, ад спёкі памлела дашчэнту трава.
А вось і дажджынка ўпала на ландыша лісцік,
Як добра, што ўпору. А я пасняшаю, бывай.

***Алесь СУЧОК***

## ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ

Сваю маладосць прысвяціў барацьбе -
Ты мужна ішоў на змаганне.

Таму мы падзяку прыносім табе,
Пашану, любоў і прызнанне.
Жыццё расквітнела - такое хацеў,
Набрала і сілы, і гарту.
За гэта жыццё ты у турмах сядзеў,
Пілуючы вершамі краты.
І верыў, нязломны, што воля прыйдзе,
На цёмныя нівы і гоні.
І трактар надзеі на іх загудзе,
І светлымі стануць загоны.
Шкада, што не бачыш ты сённяшніх дзён,
Бо рана сышоў у магілу,
Прымі ад нас нізкі зямляцкі паклон
За вершаў магутную сілу.
Няхай прабягаюць гады чарадой,
Твой подзвіг мы век не забудзем.
Ты ў вечнасць сышоў як змагар і герой
І памятным век будзеш людзям.

*1988 г.*

***Пілір ПЕСТРАК***

## РЭХА

*Памяці В.Т.*

Мне не забыцца страты гэтай
Неспадзяванай, без пары,
Калі я друга і паэта
Згубіў у здрадлівым віры.

Хацеў ён многа і прыгожа,
Але… паблыталі шляхі
Дні злыдняў, подступаў варожых,
Пагроз і сыканняў глухіх.

Душою сцішанай панікнуў -
Ён аддаляўся ад мяне,
А я амаль ўслед не крыкнуў,
Не верачы, што згас прамень.

Усплёскі Нарачы вітаю
Я кожны ранак залаты
І рэхам бору залятаю
Туды, дзе спіш навекі ты.

Хай рэха прынясе з паветрам
Знаёмы голас: "Ты прыйдзі!.."
Твой голас друга і паэта,
Каб я не быў… не быў адзін.

*Алег ЛОЙКА*

## ШКОЛА ТАЎЛАЯ

"Пілую вершам краты…"
Лёс даў дапілаваць,
Даў год трыццаць дзявяты -
Танкістаў цалаваць.
Грымлівыя калоны,
А зоркі, як з нябёс.
Зырчэлі з веж зялёных,
Іначачы нам лёс.
І сведкай будзь мне, школа,
З якой пан выгнаў Вас,
Як дружна, як вясёла
Вучыўся ў ёй мой клас.
Ні болю ранняй страты,
Бо дужы Вы, жывы,
А ў сэрцы верш пра краты
Яшчэ насілі Вы.
Ды - чэргі аўтаматаў,
І ў друз ляцела шкло,
І зноў на вокнах краты,
Як школаў не было.
І ўсё, бы ў павуціне,
Закратаваны твар.
О дзе Вы, Валянціне,
З Рудаўкі камісар?..
Пёк боль заўчаснай страты,
Бо Вы ўжо нежывы:
Чытаў я верш пра краты,
Што пілавалі Вы.
І сведкай будзь мне, школа,
З якой пан выгнаў Вас,
Ты й школай камсамола
Была для ўсіх для нас.
Для ўсіх нас немалая,
Ты нам, як верш, гула,
Бо й школаю Таўлая
Для ўсіх для нас была!..

*Юрка ГОЛУБ*

## ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ

Песня крылле апальвала
На нямых агнях журавін…
А па этапу, да сумных пальмаў
Звінелі вязнямі журавы!..

О! Далёкіх гадоў трывога,
Трывога явак…
Вятры наўзрыд!
Ляцелі вершы з муроў астрога
Ў Іспанію, у Мадрыд…
І адстуквалі пальцы кропкі:
"Прашу дазволіць…"
"Хачу у бой!.."
У Бяздонным* салёнай кропляй
Мой не затоне боль!

Прарастаюць зарніцы сполахам
На азёрнай тугой шчацэ,
І песня, калісь падпольная,
Праз мяне ад яго цячэ!

** Возера непадалёк ад вёскі Рудаўкі на Слонімшчыне, дзе жыў бацька паэта.*

*Сяргей ПАНІЗЬНІК*

## "ПІЛУЮ ВЕРШАМ КРАТЫ"

*Пракурор праз кодэкса артыкул*
*углядаўся ў кожны мой радок,*
*нават пальцам асцярожна тыкаў*
*і ацэньваў: за радок - гадок.*

*Валянцін Таўлай.*

За радок - гадок:
толькі крок убок, -
муза - корчыкам.
Каб жа быў шасток…
не ўзляціць браток
з яркай початкай.
не Парнас - грудок.
Быў паэт - гудок!

…Дух на ворчыку.
Мо знайсці масток?
Вунь гатоў хадок
славіць "кормчага".
Пракурорскі змрок…
на пяро - курок
з чорным росчыркам.

*Алена ЯХАНТ*

## В. ТАЎЛАЮ

Дарагі паэт, што насараднiла?
Адказ толькі зараз змагла я знайсці.
Я пра Твой подзвіг у кнігах чытала.
Па сцежках Тваіх давялося прайсці.

У Сеняжыцкім лесе грыбы я збірала,
Ты ў лесе з сувязнымі сустрэчу шукаў,
Нам Главінская Каця аб тым павядала.
Светлы Дзень Перамогі Ты, як мог паскараў.

Я прыехала ў горад, дзе Ты нарадзіўся.
Там, ля чыгункі, дзе бацька служыў для людзей,
35 - у адну школку, мой шлях не мяняўся.
У той школцы чацвёртай я стварыла музей.

Той музей я Табе, наш паэт, прысвяціла.
З Тваіх вуснаў моц і вера народа гучыць.

Шчыры дзякуй, зямелька, што яго нарадзіла.
Наша ж задача - нашчадкам сваім расказаць.
2009 г.

***Таццяна ЯЦУК***

## ДА ЮБІЛЕЮ МУЗЕЯ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ Ў СШ №4 г. БАРАНАВІЧЫ

Знічка загарэлася, мігае,
А ў нас сягоння юбілей!
Школа насцеж дзверы расчыняе,
Запрашае ў госці да Таўлая
Шчыра і з любоўю наш музей.
Час тамы гісторыі гартае,
І ўжо нямала дзён прайшло.
Праз гады мы помнім пра Таўлая…
Раненаю птушкай на крыло
Узмацніўся ён і акрылёна
У паднябессі над зямлёй лунаў.
Шум бяроз, трывожны пошум клёна
І змаганне за народ - вайна.
Нам свабода не далася дарам,
Недарма паэт пражыў жыццё.
За ідэю - неба без пажараў
І жаданай праўды адкрыццё.
З тых часоў прайшло нямала маяў,
Зацвітаюць кветкі на мяжы.
А асоба мудрая Таўлая
Вучыць нас заўсёды годна жыць.
*2014 г.*

***Алесь КОРНЕЎ***

## НЕ ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ У БЯДЗЕ

Калі не хочацца жыць у бядзе, -
Ідзі ў касцёл, маліся, слухай месу.
Дзяцей вучы, ды ўжо няма нідзе
Школ беларускіх тут, ва ўсходніх крэсах.

Таўлаі ўсё ж у падрыхтоўчы клас
У Слоніме сыночка ўладкавалі.
Вучыся польскаму. У добры час!
Ды… беларусам там назваўся Валік.
"Дык прэч са школы!" - лаялі ўсяляк
І з Віленскай гімназіі паперлі.
"Калі ты ў Польшчы, значыцца - паляк
І не пішы на свінскай мове перлы."
Але сябры ўгаворвалі: "Пішы!"
І віў радкі ён свойскія, тугія -
Пратэст зняволенню і крык душы!
Неўтаймаваная ў грудзях стыхія!
А як жа жыць? Тут не лічы да трох.
Не прызнаюць у беларусе брата.
Не семінарыя яму - астрог!
Не ў клетку сшытак, а стальныя краты!
"Ці ж першага вы судзіце мяне
За прагу волі, годнасці і праўды?
О, лёс! Чаму ў радзімай старане
Бязлітасна мяне так абабраў ты?"
"Крышыце панскае ярмо, браты!"
За раўнапраўе і за подых чысты!
І… збавіўся ўціску і бяды!
Ды грымнуў гром!..
Шчэ горшыя фашысты…
Стары Таўлай, сябрук яго паляк…
Як двух братоў іх аб'яднаў Асвенцім.
А Валік, сын, у роспачы не змяк.
Ды зноў турма - у страшным сорак трэцім.
"Каму я вочы перадам свае
І сэрца, што астынуць не паспела?"
Засценак стогне, плачучы пяе
Пад роў франтоў у сотні дэцыбелаў.
Да скону набліжалася вайна,
Звярэў захопнік, упіраўся рогам.
І вось прыйшла - як сонейка, яна! -
У бітвах змучаная Перамога.
О, край крыві! І попелу! І слёз!
Цябе абновім працаю сумеснай!
Але ж у трыццаць тры, нібы Хрыстос,

Паэт узнёсся ў неба разам з песняй.
І з вышыні даносіцца ледзь-ледзь…
Але чуваць, як ён пяе пра тое.
Што край наш будзе "вечна зелянець,
Як дрэва стройнае і маладое".

*2014 г.*

***Віктар ШНІП***

## БАЛАДА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ
## (8.02.1914 - 27.04.1947)

У дом свой, у Ліду вяртаешся з Мінска
І вершы з сабой, як набытак, нясеш.
І следам ляціць вераснёўскі вятрыска
І ён раздзюмае ў табе новы верш.
Няблізка ісці, але шлях свой праходзіш
І Тут застаешся ля блізкіх людзей.
На небе халодным, нібыта на лёдзе,
Ты зоркі малюеш, каб стала святлей
І ў Лідзе, і ў Мінску, і ў роднай краіне,
Якую ты любіш, якая з табой
У сэрцы і ў вершах, і ў спелай рабіне
На снезе бялюткімваўчынай зімой.
У доме вялікім, вярнуўшыся з Мінска,
Ты не адзінокі, ты сціпла жывеш.
І кліча цябе ў невядомасць вятрыска,
І просіць не йсці недапісаны верш…

*15.11.2020 г.*

***Людміла КЕБІЧ***

## СЛОВА ЯДНАННЯ

*Пісьменнікам-змагарам за яднанне народа*

Вы жылі і пісалі ў складаных умовах.
Закіпала на сэрцы бунтарская кроў.
Палымянае, мужнае, трапнае слова
Да яднання склікала суседзяў-братоў.

Ваша слова яднання, ляцела штовечар
Цераз межы, на ўсход, бо нядоля, як квет,
Прыгнятала, душыла не па-чалавечы
Раз'яднаны сілком беларускі народ.

Ну чаму, чым другім, вам было болей трэба?
За яднанне народаў рупліўцаў не шмат.
Не спыняла вас нават у клетачку неба,
У якое гадамі глядзелі з-за крат.

А малітва была за адзінства народа:
Каб той час надыйшоў, і брат брата абняў.
І той верасень трыццаць дзявятага года
Днём святочным яднання народнага стаў.

Сёння помнім мы вас, змагары і ратаі,
Васілёк і Кляшторны, Пястрак і Таўлай…
Ваша зброя адметная - слова яднання -
Абудзіла народ, аб'яднала наш Край.

*Верасень, 2023 г.*

***Сяргей ЧЫГРЫН***

## ВЁСКА РУДАЎКА

*Памяці Валянціна Таўлая*

Прыехаў ў Рудаўку, дзе жыў наш Таўлай,
Я клічу Таўлая - выходзь, сустракай.
І вуліцы тыя, і хаты стаяць,
Не хоча мяне Валянцін сустракаць.

Ніхто не выходзіць з пахіленых хат,
Ні сам Валянцін, ані дзед яго, брат.
І хатаў старэнькіх самотны пагляд,
Што помняць усмешкі вясёлых дзяўчат.

Тут кожнага ведаў шчаслівы Таўлай,
Ў Рудаўцы сябры абуджалі свой край.

Гучалі тут песні да вёсак бліжэйшых,
І Валянцінам напісаны вершы.

Якімі ён краты пілаваў у Лукішках,
І марыў трымаць у руках свае кніжкі…
Прыехаў ў Рудаўку, а дзе Валянцін?..
Ніколі не быў ён у вёсцы адзін.

А дзе той таварыш нашай вясны,
Дзе сніліся дома шчаслівыя сны?..
Я сумна глядзеў на сады і Рудаўку,
І ціха прысеў адзінокі на лаўку.
*12 снежня 2023 г.*

***Станіслаў СУДНІК***

**ПА ЛІДЗЕ БОГ ХАДЗІЎ**

*У 1943 годзе беларускі камуністычны*
*паэт Валянцін Таўлай, арыштаваны немцамі,*
*быў выкуплены з нямецкай вязніцы за грошы,*
*сабраныя жыхарамі горада Ліды.*

Паэтаў саджалі ў вязніцы спрадведку,
І тое за дзіва ніхто не лічыў,
У вершах свабодным ён быў чалавекам,
А кожны царок за свабодай сачыў.

Не стала цароў - пільнавалі баяры,
Баяраў не стала - сачыў сабакар,
Ды толькі заўсёды і краты, і нары
Ахвотна паэтам падносілі ў дар.

Не велькае дзіва: схапілі Таўлая
І гэтак, як многіх, шпурнулі ў турму.
Не важна: была там віна і якая?
Асвенцым замроіў праз краты яму.

Ды ж дзіўнае дзіва забачыў свет гэты,
Такога не зналі ў тутэйшай зямлі,

З нямецкай вязніцы дасталі паэта
За грошыкі тыя, што людзі далі.

На хлеба кавалак самім не ставала,
І лёс невядомы чакаў за вуглом,
На выкуп Таўлая ўся Ліда збірала,
Завязваўшы пояс мацнейшым вузлом.

Ад шчырага сэрца, напэўна, давалі,
Бо грошыкі тыя на справу пайшлі.
Паэта ад смерці яны ўратавалі
На славу і гонар радзімай зямлі.

***

А я вось, пачуўшы гісторыю гэту,
Прыдумаць выснову адзіную змог:
Як тут выкуплялі з палону паэтаў,
То, значыць, хадзіў па зямлі гэтай Бог.

*Уладзімір ВАСЬКО*

## ТАЎЛАЙ НАТХНЯЕ

Гісторыя лёсы ламае,
Як дрэвы завея ліхая.
Ды постаць жывая Таўлая
На подзвігі й сёння натхняе.

Ад Рудаўкі крочыў ён смела
Да Вільні, да шчасця, да ведаў.
Ды ўлады накладвалі вета
На шлях і задумы паэта.

І гумай, і шомпалам білі,
Турму яму домам зрабілі.
Ды ён не змарнеў, не зламаўся:
За праўду і волю змагаўся.

Адвагай быў вельмі багаты
І ўрэзаўся вершам у краты.
І ў волата вырас хлапчына,
І гонарам стаў для Айчыны.

І нас анідзе не зламае
Ніякая сіла ліхая,
Бо мужная постаць Таўлая
На подзвігі й сёння натхняе.

*26.12.2013 г.*

*Алеся БУРАК*

## У ВЯНОК ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ

I

Люты. Ладзіць баль віхура,
К тыну лашчыцца завея,
Хмары сцелюцца панура.
Вецер за сцяной шалее.

За акном мароз і сцюжа…
А ў хаце, ля цяпельца
Нарадзіўся хлопчык мужны,
Светлы розумам і сэрцам.

Гадавала яго маці
Для любові, шчаснай долі,
Не ўзгадала, што ўзрасціла
Смелага байца з няволяй.

Ва ўзросе падлятковым
Сын абраў свой шлях цярністы,
Ваяваў бунтарскім словам,
Думкаю, памкненнем чыстым.

Ратаваў за ўз'яднанне
Беларускага народа,
Меў за гэта пакаранне:
У турме гібеў ён годы.

II

Ты зрабіў нямала ходак пешшу
Па шляхах нялёгкіх і крутых,
Ты стварыў артыкулы і вершы,
Што праграмай сталі для другіх.

Ты сваім агніста мудрым словам
Прадракаў радзіме светлы лёс,
Родную пакутлівую мову
Праз выпрабаванні ты пранёс.

І гучыць яна прыветна-звонка
На аблогах роднае зямлі,
На зямлі свабоднае старонкі,
Што ў баях абараніць змаглі,

Засланіць ад ворага ліхога
Нашу еднасць, наш цудоўны край.
Ты для нас, нашчадкаў, значыш многа:
На ніве годнаці - выдатныаратай.

III

Аб Лідскай крэпасці ў кірунку рынка
Я крочу сцежкаю, дзе ты ступаў,
Спыняюся ля сціпнага будынка,
У якім ты жыў, тварыў і сумаваў.

І магчыма, тут пісаў сястрычцы
Вершык, каб запомніла яна,
Што яе шчаслівае сцяжынцы
Ты аддаў жыццё сваё спаўна.

Я лічу сябе тваёй сястрою,
І тваім высновам я служу,
Лепшым скарбам кожнаю парою -
Вольнай Беларуссю даражу.

*2005 г.*

***Алесь СТАДУБ***

**ВЕЧНАСЦЬ РОДНАГА ДУХУ**
**(Роздум паэта Валянціна Таўлая)**

Няўжо не быў я ў Празе
Промнем сонца,
Калі Скарына ўсё рабіў
Набела,
І ў друк ішло,
Чаго душа хацела?
Няўжо не быў я ў Празе
Праменнем сонца?

Няўжо не быў
З Тарасам на Парнасе,
Па-беларуску кпінячы
З багоў?
Ніхто з нас не уцякаў
Адтуль бягом,
Калі быў я
З Тарасам на Парнасе.

Няўжо не ўспомняць
Мо праз сто гадоў,
Што вершаў вастрыню
Тачыў навыраст?
Не, не забуду Танкаў
І Гранітаў выраз:
"Мы волі аддалі -
Удячнай - доўг".

Яна ў мяне
Другім крылом была.
Другім.
Змаганне было першым.
Быў сувязным,
Быў журналістам пешым,
Круты і добры
Валянцін Таўлай.

Любіў ідэяў
Мудры перагруз,
Ішоў бясстрашна
Пад айчынным сцягам.
Вытокі вымятаў -
І Вязынку, і Прагу -
Святы і грэшны,
Сціплы беларус.
*2007 г.*

## ТУТ
***Трыпціх***

*Валяціну Таўлаю*

### 1

Не ведаю, хто клопат ранні
У мураванцы думна месціў.
Кватараваўся тут змаганец,
Упарты Валянцін-бяссмерце.

Была б з бярвення хата, можа,
Струхнела б, перажыўшы спеласць.
Сягоння поўна тут, прыгожа
І ва ўспамінах дар і смеласць.

Заўжды быў цвёрды і праўдзівы,
Не воліў да сябе спакою.
Гады ўслаўляюць выраз дзіўны:
"Мудрэць і харашэць душою".

Цяпер у стойкім філіяле
Ўслаўляецца ўсё сілай праўды.
Тваё мы эстафецім, Валя,
Мы за тваю нязломнасць рады.

Жыццё кароткае, няйначай,
Для таленту яно - бяссмерце.
Хто тут пабыў - сябе зыначыў.
Жыве тваім нязгасным сэрцам.

**2**

Здаецца, вышаў падыміць.
Мо з вершаў выкрасліць заганы,
Мо зелень для гасцей памыць,
А мо па нарыс быў пасланы.

Няхай сабе. Пабудзь адзін
У вечнаці, наўсцяж скандальнай.
Мы на партрэт твой паглядзім
І пашкадуем: ты ўжо дальні.

Душа пісала праўдзе доўг,
Свяціілі мары па-братэрску.
Не верыцца, што шмат гадоў
Ты не ўсміхаешся ў люстэрку.

**3**

Зайдросцяць праўнукі і ўнукі:
Іх дзед раўняўся на свяціл,
Ім іншае далося ў рукі,
Іх талент іншае спасціг.

Па-своему з нас кожны здольны,
Сваіх памкненняў уладар.
Адзін - пірог, другі - настольнік.
У кожнага свой лёс і дар.

*Міхась МЕЛЬНІК*

## РАЗАМ З ВАЛЯНЦІНАМ ТАЎЛАЕМ

На вуліцы Замкавай домік Таўлая
Так ветліва творцаў усіх сустракае.
Сюды мы завітваем, быццам на споведзь,
І душы свае ад тлуму адводзім.
Сюды мы ідзём, як на веча ці свята,
Тут многа сяброў і натхнення багата,
Тут мы абмяркоўваем нашы праблемы
І высвятляем надзённыя тэмы…
Ліра паэта жыве сёння з намі
Ды не сціхае ніколі з гадамі,
Мужнае слова яго заклікала
Змагацца за волю і з рознай навалай…
Зведаў астрогі, нямала нягодаў,
Але ён заўсёды быў разам з народам.
Рана ўключыўся ў падпольную дзейнасць,

Каб захаваць сваю годнасць і вернасць
Зямлі беларускай, бацькоўскаму краю,
Які Прынямоннем мы называем.
Жыў барацьбіт гадоў некалькі ў Лідзе,
Ля замка штодзённа ў задуме хадзіў ён,
У горадзе гэтым спаткаўся з Купалам,
Песня чыя яго сэрца кранала…
Дачасна пакінуў свет стойкі паэт,
А творы для нас як святы запавет:
Паэмы і шчырыя вершы чытаем,
Каб заставацца разам з Таўлаем.

***Алесь МАЦУЛЕВІЧ***

**ГОСЦІ ПАЭТА**
**Да 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая**

*Аўтару верша ў 2003 годзе
давялося сустрэцца з Марыяй
Маркаўнай Рэсухінай і Леанардай
Браніславаўнай Пуйдак, якія былі
частымі гасцямі паэта, супрацоўніка
газеты "Уперад" Валянціна Таўлая, калі
той жыў у Лідзе (1939-1941 гг.)*

"Уперад!" - часу трубы клічуць.
Ідзе жыццё хадою новай.
Марыя з Леанардай пішуць
артыкулы аб абутковай.

Нясуць у домік побач з замкам
іх - на рэдагаванне Валю.
Гарыць да ночы позняй лямпа,
што Валя вечарам запаліць.

Ён рэдагуе (вопыт большы).
Дымяцца ў кубках чай ці кава.
Аповеды - пад чай - аб Польшчы.
Расказвае Таўлай цікава!

І ноч становіцца бяссоннай,
імгненнем яркім пралятае…
У доміку яго і сёння
з паэтамі сядзім за чаем.

У тыя ночы кіну мосцік -
карціна бачыцца такая:
Марыя з Леанардай - госці
паэта-змагара Таўлая.

## У ДОМІКУ ТАЎЛАЯ

Нібы ля дзеда ўнук-паэт,
ля замка - дом-музей Таўлая.
Яго пакой, яго партрэт
і лямпа на стале старая.

Здаецца, у пакоі тым
яго і сёння чутны крокі.
Пачуй, як дыхаюць лісты,
дыханне дакументаў копій.

Пераступі цяпер парог
пад гэтым позіркам нязгасным -
зрабі з яго пакоя крок
у свет паэзіі сучаснай.

А на другім паверсе ты
Майстроў паэзіі пабачыш.
Заходзь да іх! Заходзь сюды!
Глянь, колькі сэрцаў тут гарачых!

Смялей! Не цісніся ў кутку!
А мо і ты таленавіты?!
Табе падораць кніжку тут
з аўтографам паэта Ліды!

Адчуй паэзіі цяпло,
снег лістапада, зелень мая:
нязгаснае яе святло
гарыць у доміку Таўлая.

## ТАЎЛАЙ У ЛІДЗЕ
**Да 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая**

Ёсць невыпадкова ў Лідзе
вуліца і дом Таўлая.
Да гісторыі звярніце
позірк. А яна такая…

У дзяцінстве, як вучыўся
ў класе ў пачатковым нейкім,
напісаў Таўлай у Лідзе
верш свой першы - "Верабейкі"…

Перамены пачаліся,
правіць пачалі Саветы -
працаваў паэт у Лідзе
супрацоўнікам газеты.

Выступаў перад народам.
Сустракаўся тут з Купалам.
Горадам натхняльным, родным
для Таўлая Ліда стала.

А як па зямліцы лідскай
акупант нямецкі рыскаў,
з бацькам, мачыхай, сястрычкай
у турме сядзеў фашысцкай…

Прыязджаў у Ліду, хворы,
на купалаўскі ён вечар…
І да нашых дзён гаворыць
ён з лідзянамі - у вершах.

Са старонак кніг не з першым
пакаленнем размаўляе.
І да нашых дзён - праз вершы -
сустракаемся з Таўлаем.

*Ірэна СЛІЎКО*

* * *

Неба пакрылася шэрымі хмарамі,
Сэрца шчыміла і сціснула болем,
Не стала паэта са светлымі марамі,
З прагай свабоды, нязломнаю воляй.

Гарачае сэрца заўчасна згарэла.
Нядоўга пражыў - усяго трыццаць тры.
З рук выбіць паперу і стаць на калені
Этапы і турмы ніяк не змаглі.

Як Данка, змагаўся за волю народа,
За праўду і шчасце радзімай зямлі.
Гарэў, асвяціўшы сабою дарогу,
Каб рэкі, аблокі шыкоўна плылі.

Шануе цяпер наша Ліда паэта,
І помніць любімага сына свайго,
І вершы бы сонцам агністым сагрэты,
Мужна лунаюць над светам яго.

*Тарэза СМОЛЬСКАЯ*

**ДОМІК ТАЎЛАЯ**

Прывеціць турыста вачніцамі вокнаў.
Запросіць прыветна з вітога балкона.
Гасцям прапануе духмянага чаю.
Гісторыі сведка - наш домік Таўлая.
Ля сцен непрыступнага гордага замка
Патрэбы няма ў штодзённай рэкламе.
Ёсць спадчына - дом Валянціна Таўлая,
Здабыўцы свабоды для роднага краю.
Ён марыў у цямніцы турмы аб свабодзе
І быў папулярным героем ў народзе.
Жадаў Беларусь-маці вольнаю бачыць.
Шмат сілы патраціў для важнай задачы.

Зямляк працаваў і ў мясцовай газеце.
Сустрэнемся з ім ў чорна-белым партрэце.
З фашызмам змагаўся не толькі вінтоўкай -
Ён ворагаў біў і пяром, і лістоўкай.
Ён - крытык, паэт, публіцыст, перакладчык.
Хай годы прайшлі, для нашчадкаў - дарадчык.
Знаёмы з ім вуліцы, бібліятэкі.
Мы імя Таўлая запомнім навекі!

*Людмила РУСЬ*

## ПОСВЯЩЕНИЕ ВАЛЕНТИНУ ТАВЛАЮ

С берегов священного Байкала,
Отполированный волнами его вод,
Воробейка - творчества начало
Тавлая - в его лидском домике живёт.

Поклон тебе, Тавлай, и восхищенье
Твоею жизнью, творчеством твоим.
Ты даришь белорусам вдохновенье.
Борец за счастье - всеми ты любим.

Гордимся тем, что в Лиде, на Лидейке,
Твой дом тобою дышит до сих пор
И в нашей поэтической семейке
Идёт частенько о Тавлае разговор.

## ПАМЯТИ ВАЛЕНТИНА ТАВЛАЯ

Немало есть людей, которыми гордится
По праву белорусский наш народ
И сколько времени бы на Земле не длиться,
В веках Тавлая имя не умрёт.

Он звал всегда к борьбе за справедливость,
За социальное равенство своё.
И не сдаваться никогда врагу на милость -
В борьбе душа свободу обретёт.

Таким он был: отважным, смелым, увлечённым
Поэтом, критиком и публицистом.
Он видел свой народ свободным и сплочённым,
Талантливым, счастливым в мире чистом.

Живёт он в памяти людей, и память та
В мемориальных досках, барельефах
И даже, в камне у деревни Маята,
Раз по дороге к ней Тавлай проехал.

Живёт насыщенною жизнью Дом Тавлая
Под оберегом замка древних стен.
Поэта добрым словом лидчане вспоминая,
Растут духовно сами вместе с тем.

*03.12.2023 г.*

***Татьяна СЕМЕНОВА***

## ПЕРВОЕ ЗНАКОМСТВО С ГОРОДОМ ЛИДА

Далекий тысяча девятьсот пятьдесят пятый год. Октябрь месяц. Впервые уехала так далеко от родного дома. Молодой супруг привез меня в город Лида. Влюбленной двадцатилетней девушке все было интересно, все нравилось, на все смотрела через розовые очки. Осень была очень теплой, люди не носили еще теплые вещи, солнце по-летнему грело, меня это несказанно радовало, так как на моей малой Родине холода наступали очень рано. Вечерами мы с мужем гуляли по улицам города, он знакомил меня с моим новым местом жительства. Первая прогулка была к крепости, поскольку мы жили на улице Чапаева, то это была самая ближняя достопримечательность. На пути к крепости привлек внимание аккуратный, деревянный выкрашенный в цвет золотистой охры домик с мезонином. В нем размещалась больница. Больше никаких сведений я не получила. Вокруг крепости на земле валялось много камней больших и маленьких, высыпавшихся из стен во время бомбежек. Жаль - разрушен архитектурный памятник. Замком его както никто не называл, все говорили "крепость". Перед ней простиралось грязное месиво - болото, через которое протекала небольшая, неглубокая речушка, в которой даже белье полоскала. За стеной крепости по правую сторону, там, где размещался домик с мезонином, стояли одноэтажные дома, некоторые даже очень старые с окнами, вросшими в

землю.

А выше по Советской улице, недалеко от крепости, возвышался костел, он был огражден каменным забором. Во дворе, отдельно от костела, была невысокая колокольня. Дальше был пустырь. А на улице Ленинской, против теперешнего горисполкома стоял полуразрушенный дом. Говорили, что там была мельница, но во время войны разрушена. А муж шутил: "Давай, отгородим себе уголок и будем здесь жить". Своего жилья у нас еще не было.

Улица Победы упиралась почти что в наш дом, где мы жили в квартире у свекрови по улице Чапаева. Мы переходили улицу и оказывались на Победе. И снова моему удивлению нет предела: торчат в земле какие-то колья. Спрашиваю:

- Что это за колья?

- А это парк будет, - отвечает мой спутник.

Очень скоро на месте кольев выросли огромные тополя. Они в какой-то мере осушили грязь перед крепостью, вобрали в себя влагу.

В городе не было многоэтажных домов, кроме двух, построенных обувной фабрикой на пересечении улиц Советской и Мицкевича, где долгое время находится магазин "Світанак". Далее по улице Советской был расположен детский сад № 5 обувной фабрики на 100 мест, в котором позже мне довелось работать.

На всю жизнь запомнился первый поход в кино. Не кинотеатр, а просто зрительный зал находился в старом доме на углу улицы Советской и Тавлая. Дом был совсем ветхий, доски пола прогибались под ногами. Как-то мне показалось - очень неуютно было. Не запомнила о чем фильм, потому что он был на белорусском языке, а я первый раз услышала белорусскую речь. Удивительно, но после этого ни разу не демонстрировались фильмы на белорусском языке. Почему? Мне было интересно узнать, кто такой Тавлай, в честь которого названа улица. Ответили безразлично: "Какой-то поэт". На этом я остановилась.

Перезимовав на квартире у матери, мы перебрались на съемную квартиру на улице Энгельса. Каждый день я ходила по улице Замковой уже с ребенком на руках возле крепостных стен и мимо домиков с низкими окнами к своей свекрови на улицу Чапаева. И почему-то боялась, мне казалось, в этих домах живут какие-то разбойники. Наверное, потому, что много слышала, что в первые годы после войны возле крепости было опасно ходить - орудовали банды.

И вот насмешка судьбы: через год нам дали квартиру именно в том доме, которого я больше всего страшилась. Оказалось, что в нем жили самые замечательные люди: две сестры-фронтовички - Балабай

Зоя Дмитриевна и Архипова Вера Дмитриевна. А еще в этом доме проживала одинокая пожилая женщина Ошмяна Ольга Яковлевна, жена репрессированного машиниста-железнодорожника.

Во дворе дома росли три старые яблони, а одна прямо под нашим окном, у самой калитки. Она каждый год плодоносила, а самое главное - как красиво буйно цвела. Листьев не было видно, один лишь белый цвет.

Все жильцы были дружны между собой. По вечерам устраивали посиделки во дворе, много общались. Осенью всем поровну делили урожай яблок.

Огород наш доходил до самой речки, из которой мы брали воду для полива. Говорили - это Лидейка, а на другом берегу находился кожвендиспансер в домике с мезонином. Во дворе домика часто бегали мальчики-подростки с бритыми головами. Во дворе всегда было чисто, и домик всегда выглядел опрятно. Что это домик Тавлая и кто он Тавлай, я не знала, нигде не интересовалась, стихи не писала, некогда. "Кожвен" и "Кожвен" назывался в обиходе этот красивый домик.

В один прекрасный день "Кожвендиспансер" переехал на улицу Островского, а в домик поселилось спортивное общество "Урожай". Картина резко поменялась: домик стал неухоженным, ходили слухи, что его снесут.

Прошли годы, наша семья уже жила в благоустроенной квартире. Но мы не забывали наше первое пристанище, навещали своих соседей. Жили оба дома: и Замковая № 3 и Замковая № 7. Все изменил 2010 год - в Лиду пришли "Дожинки". Город покрасивел, изменился до неузнаваемости. Снесли старые постройки. Под снос угодил и бывший наш дом по Замковой № 3 - жаль. Нам жаль, больше никому. Там теперь стало красиво. А грусть наша - стариковские эмоции.

## ЭМОЦИИ

На фоне замка - крошка -
Дом старенький стоял.
По самое окошко
Он в землю утопал.

В том домишке старом
Когда-то я жила.
Мне, как судьбы подарок,
В нем комнатка была.

Здесь дочь моя родилась,
Кудрява и мила.
О, как же я гордилась!
Я счастлива была!

А мне было в ту пору
Чуть больше двадцати.
Сверну, казалось, гору
К вершинам на пути.

Времечко бедовое
Пронеслось с тех пор…
Есть квартира новая
И многолюдный двор.

Но нет, мы не забыли
Свой домик у реки.
К нему мы приходили.
Теперь уж старики.

Вдруг домика не стало.
В один прекрасный день,
К дожинкам он растаял,
Как в ясный полдень тень.

Вместо дома плиточка,
Дорожка в никуда.
Где была калиточка,
Там плещется вода.

Мы стоим печальные
У кромочки воды.
Эмоции прощальные
Теснятся из груди.

Мы грустно пошутили -
Уплыли те года.
Здесь юность утопили
Нашу навсегда…

К счастью домик с мезонином - домик Тавлая реставрировали, обновили, отремонтировали и разместили в нем литературный отдел историко-художественного музея. Здесь постоянно проходят литературные встречи лидских поэтов, оформляются выставки, проводятся различные интересные мероприятия под руководством научного сотрудника Хитруна А.Ч. и Колодяжной А.А. Горжусь, что имею возможность посещать Дом В.Тавлая, пополнять свои знания о его жизни и деятельности. Первые уроки я получила от бывшего руководителя "Сукверцця" Мельника М.И, за что очень благодарна.

Дом Валентина Тавлая - интересный и познавательный музей. Он притягивает к себе, это наша реликвия. А реликвию надо беречь.

**РЕЛИКВИЯ**

Уютно обновленный домик Тавлая
С достоинством смотрится в зеркало вод.
И кажется: звонкие рифмы слагая,
Поэт по крылечку родному идет.

Ступает наверх по незвучным ступеням,
Туда, где собрался наш творческий люд.
Поэты уже из других поколений
О нем, о Тавлае, беседы ведут.

Здесь знают и помнят заслуги поэта,
С любовью творенья его берегут…
Как дорог нам домик - реликвия эта!
Здесь музы творцов постоянно живут.

*Ноябрь, 2020 год.*

## БОРЦУ ЗА НАРОДНОЕ СЧАСТЬЕ

Так мало лет отмерила судьба
Для жизни, творчества, добра и счастья:
То с юности подпольная борьба,
То за свободу с лютой, мерзской властью.

Умел Тавлай зажечь, сплотить людей,
Народ вести вперёд за правду к бою.
Всегда был полон творческих идей
И всюду он же рисковал собою.

А тут война, фашистский страшный плен -
Гестапо, пытки, муки, боли.
Но крепло мужество тому взамен,
Не сломлен дух и сила воли
В тюремно-каторжной неволе.

И стих звенел, как праведный набат,
На поле брани всех зовущий.
Всем сердцем откликались друг и брат,
И шли за ним, вперёд идущим.

Мечтал борец во многом воплотиться
На всё ему хватало в этом сил.
К несчастью, с недугом пришлось сразиться.
И в этой схватке он же победил…

Угас поэт в расцвете своих лет…
Не все свои задумки завершил…
Для нас, живущих, он оставил след…
Как хорошо, что здесь он тоже жил…

*11 ноября 2023 г.*

*Алесь ХІТРУН*

# СЦЭНАРЫЙ ДА ІНСЦЭНІРАВАНАГА АПОВЕДА "У ТАЎЛАЯ ПАБЫВАЕМ... ПЕРАД ПАЧАТКАМ ВАЙНЫ"

**У ролях супрацоўнікі Лідскага гісторыка-мастацкага музея**



***Валянцін Таўлай з першай жонкай Кірай Брандт.***
***Ліда, 1941 г.***

## Сцэна 1

*Народ заходзіць у пакой. Ён умоўна падзелены на дзве пляцоўкі. Дальняя, ля акна - жылы (рабочы) пакой. Бліжняя, пры ўваходзе - музейная экспазіцыя.*

*Насупраць акна - стол, на якім - друкарка, паперы, чарніліца з пяром, рукапісы, аловак. Са столі звісае свяцільня - жырандоля. У ёй гарыць свечка. За сталом на крэсле сядзіць Валянцін Таўлай, нешта піша. Побач ля яго - на канапе сядзіць яго жонка, Кіра Брандт. Штосьці чытае. З левага боку, ад акна - шафа, на якой стаіць гармонік, з правага, ля Кіры - этажэрка з кнігамі, грамафон і інш.*

*Людзей сустракае Чытальнік.*

**Чытальнік:** Валянцін Таўлай - заходнебеларускі паэт. Яго жыццё - гэта прыклад мужнасці і справядлівасці, гэта ўзор беларускай літаратуры ў міжваенны і ваенны перыяды. Праз лёс маладога паэта можна прасачыць той час, праз які прайшла цэлая плеяда беларускіх пісьменнікаў.Творы Валянціна Таўлая раскрываюць боль беларускай зямлі, роднай мовы, у іх адлюстраваны гнеў да прыгнятальнікаў, яны пранізаны справядлівасцю, у якой заключаецца надзея на лепшы час. Валянцін Таўлай - гэта эпоха гераічнай, непахіснай, самаахвярнай барацьбы за вызваленне Заходняй Беларусі.

Для горада Ліды Валянцін Таўлай - асоба, на якую павінна раўняцца рэгіянальная беларуская літаратура. Імя Валянціна Таўлая носяць адна з вуліц горада і філіял раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы. Найважнейшай памяцю паэта з'яўляецца будынак - дом, у якім жыў творца з кастрычніка 1939 па чэрвень 1941 год. У верасні 2010 года быў адкрыты Дом Валянціна Таўлая як філіял Лідскага гісторыка-мастацкага музея. З таго часу працуе мемарыяльны пакой, які створаны па ўспамінах сястры паэта Ніны. У стылізаваным пакоі, экспануюцца прадметы, праз якія можна акунуцца ў эпоху 1940-х гадоў. Так, прадстаўленыя прадметы - гэта маўклівыя сведкі гісторыі. Але ж час не стаіць на месцы. Прыйшла пара іх абуджэння!

Паважаныя прысутныя, зараз вы патрапіце ў перадваенны час. Так, менавіта праз дыялог і пэўныя дзеянні двух герояў - Валянціна Таўлая і Кіры Брандт вы пачуеце балючую гісторыю, праз якую давялося прайсці заходнебеларускаму паэту Валянціну Таўлаю дзеля таго, каб нашае сённяшняе жыццё не было пакутным і трагічным і мы смела маглі сябе называць беларусамі, не цурацца гэтай нацыянальнасці, любіць сваю Радзіму і перадаваць гэтую любоў і павагу з пакалення ў

пакаленне.

І так, для вас - інсцэніраваны аповед "У Таўлая пабываем… перад пачаткам вайны".

*Гучыць ціхая музыка.*

*Валянцін у задуменні, піша, спыняецца, аб нечым думае, зноў бярэцца за паперы… Штосьці знаходзіць у стосе папер… Валянцін паглядае на Кіру, быццам хоча нешта сказаць ёй, стрымліваецца…*

**Валянцін:** Што ты ўсё вяжаш?

**Кіра:** Як што? Для Ніны рукавічкі.

**Валянцін:** А мне штосьці трывожна стала.

**Кіра:** І ў мяне нейкае пачуццё страху.

**Валянцін:** Можа што з бацькамі здарылася?

**Кіра:** Даўнавата не бачылі іх.

**Валянцін:** Ды і Ніна ўжо пару дзён не наведвалася. Жывуць жа побач.

**Кіра:** І я хацела б яе пабачыць і памераць яе руку, каб рукавічкі падышлі.

**Валянцін:** Люблю я сваю сястрычку. Не падабаецца мне, калі Ніна, як прыбяжыць сюды, то бегае па кветніку, па клумбе. Я яе ў крэсла тады саджу, даю кнігі. Чытаць яна ўжо ўмее, яе бацька з мамай яшчэ да школы навучылі. Сцепаніда Паўлаўна - настаўніца ж, у Кракаве прайшла настаўніцкія курсы. Балуюць Ніну. Лянуецца яна. Ёй і скрыпку купілі. Ат, гэты бацька. Ён сам вельмі любіць музыку і ўмее іграць на балалайцы, на мандаліне. Вось яго гармонік на шафе.

**Кіра:** Трэба будзе самім іх наведаць.

**Валянцін:** Так, сапраўды. Абавязкова сходзім. Жывуць - рукой падаць… З-за гэтых камандзіровак дык і часу ўсё не маю. Шмат працы. Трэба ж аб'ехаць і раён, сабраць матэрыял, напісаць і аператыўна змясціць у газеце. Каб не мае калегі, на якіх я магу пакласціся, то справы былі б дрэнь. А так, Ніна Тарас, Якуб Міско хаця б па мясцовасці штосьці збяруць. Глядзі - і ўжо газетная паласа гатовая.

**Кіра:** Ты яшчэ скажы, што на вас трох трымаецца газета?

**Валянцін:** Вядома, не. Штат у нас, хоць невялікі, але нямала ў нас уласных селькораў, якія час ад часу прыносяць свае занатоўкі ў рэдакцыю. Дарэчы, умеюць пісаць. Ды і маладых літаратараў нямала. Стараюся добра адносіцца да іх, каб пісалі, далучаліся да нас. Самі мяне знаходзяць. Куды ні паеду, то як магнітам прыцягваюцца. І гэта добра.

**Кіра** *(уздыхнуўшы)*: Для цябе - гэта так. Я ўжо заўважыла гэта за

час нашага пражывання. Не шмат мы яшчэ пражылі, а ўжо разумею, што для цябе значыць сабраць народ.

**Валянцін:** А як па-іншаму? Адзін у полі - не воін. Патрэбна каманда. Без камандзіра ж войска згіне. А яшчэ кажуць, што адзін за ўсіх, і ўсе за аднаго. *(Смяецца)*.

**Кіра:** Так, напэўна, я здагадалася пра што ты.

**Валянцін** *(узмоцнена)*: Не ведаю, пра што ты думаеш. Але скажу, што я з маленства стаў такім. Усё ад бацькі перадалося. Яшчэ ў Рудаўцы, што на Слонімшчыне, бацька арганізоўваў сялян на змаганне за сваю, беларускую школу. Збіраліся яны ў нашай хаце. Пісалі заявы, складалі дэкларацыі. Ён цэлай "Грамадой" кіраваў - беларуска-сялянскім рабочым гуртком, разам з мачыхай маёй Сцепанідай Паўлаўнай. У бацькі ж майго Паўла і кватэру былі забралі за тое, што ён адмовіўся ад пакланення палякам. Мы ж ледзьве выжылі. На крапіве і рэдкай зацірцы. Мяне бабуля гадавала - Аўдоцця… Аднойчы, ідучы з бацькам: ён - у лес, я - у школу Слонімскай "прэпаранды", у так званыя падрыхтоўчыя курсы Польскай дзяржаўнай настаўніцкай семінарыі, бацька мяне папрасіў, даў як запавет: не цурацца свайго. Ён казаў, што нашы дзяды і прадзеды - беларусы, спачатку так званыя пагане, пасля - праваслаўныя, затым - гвалтам - уніяты, пасля - ізноў гвалтам - праваслаўныя. Але ж, запэўніў мяне, што заўсёды былі беларусы. І гэта значыць, што і я павінен быць беларусам. Бацькаў наказ, як запавет на жыццёвы шлях, заклаўся ўва мне.

**Кіра** *(супакойваючы)*: Я даўно заўважыла ў цябе змагарскі дух. Не можаш спыніцца ніяк. Усё за справядлівасць, за праўду… Розуму ў цябе хапае… Беларус ты мой…

**Валянцін** *(гневаючыся)*: Кіра, за сваю справядлівасць я быў адлічаны са Слонімскай настаўніцкай семінарыі. Бацька апошнія грошы аддаў, прадуктамі разлічваўся, каб я меў навуку. Там дысцыпліна была. Адны хлопцы вучыліся, толькі дзе-нідзе якія дзяўчаты на падрыхтоўчых курсах паяўляліся. У дарослых семінарскіх дзецюкоў была пастаянная туга па гімназістках.

**Кіра** *(нечакана)*: І ты таксама тужыў?

**Валянцін** *(сур'ёзна)*: Што мяне турбавала болей - дык гэта тое, што семінарыя станавілася ўсё больш кузняй кадраў будучых настаўнікаў-паланізатараў. Нават усе ранішнія малітвы - толькі па-польску - "Кеды раннэ встаён зожэ", у канцы заняткаў - адспяваннем "Вшыстке нашэ дзеннэ справы". Мяне гэта моцна раздражняла. І вось аднойчы, прыйшоў класны кіраўнік - элегантны, з пахучымі парфумамі і замест таго, каб пачаць лекцыю, ён пачаў запаўняць спіс прысутных у класе. У

рубрыкі, дзе стаялі нашы прозвішчы, ён запісваў нацыянальнасць, веравызванне, родная мова ў сям'і. Усе мае аднакласнікі адказвалі, што яны - палякі і мова іх - польская. Вось як, напужаныя былі. Але ж не ўсе. Не паспеў ён назваць маё прозвішча, як я сам ўжо стаяў ля парты. І як кулямёт адказваў на яго гэтыя калючыя пытанні. Але ж адказы былі адваротныя. Нацыянальнасць - беларус, родная мова - беларуская. Пяро злосна скрыпела, настаўнік грозна пазіраў. Аднакурснікі былі здзіўлены маёй упартасці. Мяне пазбавілі стыпендыі. Вучыўся я там не горш за іншых. І мяне выключылі адтуль.

**Кіра:** І нічым ты не змяніўся. Той жа характар. У крыві ад бацькі перадалося.

**Валянцін** *(спакойна)*: Мяне потым мачыха, Сцепаніда Паўлаўна, давучыла. Па-нашаму, па-беларуску. Я ўжо раз-пораз чытаў беларускія газеты, наталяўся купалаўскай "Жалейкай", "Шляхам жыцця", "Вянком" Максіма Багдановіч. Аднойчы, пасучы кабылку, сядзеў пад пахучай капой сена, прыгледзеўся на заход сонца і намогся выказаць вершам бачны вобраз. Верш той назваў "Вечар".

*Сонца галаву схіліла*
*За высокі лес,*
*З неба ззяе ўжо Венера,*
*Дзень спякотны счэз.*
*Загарэліся над краем*
*Залатыя зоркі,*
*І ўзышоў вялікі, круглы*
*Месяца твар горкі…*

Кіра, напэўна гэта ён, Максім Багдановіч выводзіў маёй няўмелай рукой эпігонныя спробы вершавання. Няўжо ён - мой хрышчоны бацька!

**Кіра** *(нечакана)*: А калі ты напісаў свой першы верш?

**Валянцін** *(весялей)*: Гм. Гэта ўжо асобная гісторыя. У Лідзе. Тут, Кіра, тут, у гэтым горадзе. Я нават і не спадзяваўся, што буду жыць некалі тут, дзе цяпер школа стаіць за замкам. За паўночным бокам. Тады яна называлася - Паўшэхная (Усеагульная, значыць) школа, і выкладалася ўсё на польскай мове. Так, на ёй. Што ж… Такі быў час. Усе беларускія школы закрываліся, а хто не падпарадкоўваўся той уладзе, быў пакараны.

**Кіра:** Атрымліваецца, што тут ты сфарміраваўся як паэт?

**Валянцін:** Магчыма. Ліда - горад цікавы. Народ тут адукаваны. Нават і не верыцца, што тут панавала паланізацыя. Верш гэты таксама быў напісаны на польскай мове. "Врубэлькі" называецца. Я не мог

прызнацца ў гэтым, толькі сябру па парце сказаў, а той тады падказаў настаўніцы… *(Замаўкае)* Яго зачыталі. А я стаяў пасярод класа. Мне было няёмка. Але як потым сказала настаўніца, што можа я буду вядомым паэтам, напэўна, польскім. То тады мой аўтарытэт падрос. *(Шукае ў стосе папер гэты верш.)* Вось ён. *(Узрадаваны.)* А мой харошы! Захаваўся! Ну тады слухай.

**WROBELKI**

Zima sroga. Mróz aż strzela.
Żadnych ptaków niema u nas.
Tylko wrony i wróbelki.
Biedne, biedne te wróbelki –
Nie mają co jeść.
Skaczą chlodne, skaczą glodne,
Ale cóż poradzić –
Wnet przeminie sroga zima.
Przyjdzie wiosna – i nakarmi.

**Кіра:** Ну што ж. Някепска напісаў. Настаўніца, як у ваду глянула. Прадказала.

**Валянцін** *(прачытаўшы, кажа)*: Гэта быў мой водгук на школьную кампанію "Зімовай дапамогі" птушкам. Зачыталі, здаецца, яшчэ нейкі другі мой вершык, але які і аб чым - зусім не помню. Я яго быў пераклаў на родную беларускую. Спецыяльна, каб не падпасці пад чужыя, недакладныя, а чаго добрага - празаічныя пераклады і каб не абцяжарваць такім грахом чыё-небудзь сумленне… *(Шукае ў стосе папер. І чытае.)*

*Ну й зіма! Трашчаць марозы*
*І няма ніякіх птушак* -
*Толькі вераб'і, вароны.*
*Горка гэтым верабейкам*
*З думкай аб ядзе*
*Так падскаківаць галодным.*
*Але што ж мы зробім?* -
*Вось міне зіма цяжкая*
*І вясна прыйдзе* - *накорміць.*

**Кіра:** Штосьці тут не так. Гучыць не паэтычна… На польскай мове лепш напісаны.

**Валянцін:** Не паэтычна, але ж… *(узмоцнена)* па-беларуску. Разумееш? Так атрымалася. Пасля навуковай падрыхтоўкі ад маёй мачыхі Сцепаніды Паўлаўны ў Слоніме, я вучыўся ў Віленскай бела-

рускай гімназіі. Вось там, 4 лютага 1928 года, у газеце "Сіла працы" - у органе рэвалюцыйна нацыянальна-вызвольнага руху Заходняй Беларусі з'явіўся ў друку мой першы друкаваны верш.

**Кіра:** А ці помніш яго?

**Валянцін:** А як жа ж… "У родным краі".

Свеціць сонца
У старонцы,
Квітуць дрэвы, краскі.
Песні льюцца,
Ў даль нясуцца -
Поўна ўсюды ласкі.
Усюды добра,
Толькі робра
Бліскацяць на волі
І краіна
Гэдыміна
Жджэ ўсё лепшай долі…

**Кіра:** Так, час змяніўся. Беларуская мова пашырылася. Газета "Уперад" выходзіць па-беларуску. У бібліятэцы ёсць розная літаратура, на любы густ. Ды і на рынку можна купіць дзе-які тавар. Толькі б былі грошы…А што з табой потым было?

**Валянцін** *(грозна)*: Затым у падполле ўступіў, у падпольны камсамол Заходняй Беларусі. Супраць гэтых паноў, якія разграмілі "Грамаду" - стотысячную арганізацыю рэвалюцыйнага сялянства гэтай жа Заходняй Беларусі. Мае сябры-камсамольцы ў адпор палякам, якія пафашысцку адносіліся да ўсяго нашага, беларускага, мне дапамаглі на шапірографе выдаць паэму "Непераможныя". Але ж за свае ўчынкі быў выключаны з навучальні. Ды і ў вёсцы, куды мяне адправілі сілком, я не маўчаў. Там я з'яўляўся сакратаром РК КСМЗБ. Гэтыя подлыя і там мяне падлавілі. За маю камсамольскую работу мяне зноў арыштавалі і кінулі ў турму. Амаль цэлы год да суда прасядзеў там. Гарадзенскі акруговы суд прыгаварыў мяне да 6 месяцаў зняволення ўмоўна, бо я яшчэ быў непаўнагадовы. Пракурор абскардзіў прыгавор у Віленскі апеляцыйны суд, які павысіў мне тэрмін да двух гадоў. Але ж пакуль разглядалі гэтыя дакументы, па рэкамендацыі сяброў з Вільні, з ЦК КПЗБ накіравалі мяне ў БССР дзеля атрымання належнай падрыхтоўкі для далейшай рэвалюцыйнай і літаратурнай дзейнасці.

**Кіра:** Добра, што дапамаглі. Аператыўна ўсё вырашалася.

**Валянцін:** Так, гэта мне паспрыяла ў далейшым. Прыехаўшы ў Мінск, уладкаваўся ў рэдакцыю газеты "Звязда", вучыўся на вячэрнім

курсе газетнага аддзялення літфака БДУ, друкаваў свае творы ў газетах, часопісах, пашанцавала яшчэ за год да ліквідацыі быць прынятым у члены Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Пасля спынення гэтай асацыяцыі, мяне прынялі ў члены ЦК КПЗБ і накіравалі на падпольную працу ў Заходнюю Беларусь. Я тады ў Варшаве працаваў у рэдакцыі камуністычнай газеты "Чырвоны сцяг". Доўгая гісторыя. Потым прозвішча змяніў. Канспіраваўся. А як па-іншаму? Такі час…

**Кіра:** Добра, супакойся. Цяпер у лепшым часе жывём. Навошта хавацца.

**Валянцін** *(гучна)*: І да гэтых пор у мяне там захаваліся сувязі. Кіра, у Вільні таксама ёсць свае людзі. Там я потым быў рэдактарам легальнага рэвалюцыйнага органа "Беларуская газета", пры ёй мы планавалі, што будзе выходзіць асобнае выданне - "Літаратурная старонка". Так атрымалася, што напрыканцы 1933 года я арганізаваў і правёў першую канферэнцыю рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Беларусі і падрыхтаваў да друку першы рэвалюцыйны часопіс "Літаратурная старонка". Выйшаў толькі адзін нумар, але і яго канфіскавалі. Цудам уцалела некалькі экзэмпляраў. Каму нашкодзіла "Літаратурная старонка"? Там жа збіраліся паэты-самавукі з розных куткоў краіны - Пятрусь Граніт, Алесь Рэдзька, Міхась Васілёк, Янка Чабор і шмат іншых. Пастаянныя паліцэйскія нагляды, шпікі за намі. Што ж, баяліся нас.

**Кіра:** Слова - таксама едкая зброя…

**Валянцін** *(гучна)*: Гэтая зброя моцна гаварыла супраць фашысцкіх апекуноў, пілсудчыкаў. Так, разумею, што спынілі дзейнасць выдавецкага органа, віленская дыфензіва разграміла рэдакцыю. *(Сцішана.)* Але ж не мяне. Там і сёння ёсць чалавек. Наш чалавек. Кіра, запомні адрас: вуліца Букавая, дом 41. Там жыве Любоў Андрэеўна Асаевіч.

**Кіра:** А хто гэта? Падрабязней пра яе што ведаеш?

**Валянцін** *(сцішана)*: На той час - гэта была будучая жонка Максіма Танка, з якім я потым выдаваў у Лукішках рукапісны часопіс "Краты". З Любай яны ажаніліся толькі два гады назад, у 1939 годзе, у Вілейцы, а пазнаёміліся падчас вучобы ў Віленскай беларускай гімназіі. Яна ўдалая машыністка і перакладчыца. Яшчэ ў Варшаве падвучылася - у ЦК КПЗБ. А ў доме, дзе жылі яе бацькі, мы часта збіраліся. Там мы і арганізавалі нараду рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Беларусі.

**Кіра:** А што было потым з вамі?

**Валянцін** *(гучна, моцна)*: Так, нас пакаралі, у Лукішкі пасадзілі. Чабор, Пестрак, Міско, Рэдзька... Нас хацелі задушыць. Быў працэс над "Маладой Грамадой"…Пракурор Пятроўскі нават казаў так на мяне, што я - самы таленавіты, самы небяспечны крамольнік, што мае вершы

сеюць нянавісць да Рэчы Паспалітай, хваляць савецкія парадкі і клічуць на бунт. І заклікаў сваіх выбіць з маіх рук аловак і паперу, адабраць магчымасць пісаць і бунтаваць. Пра маю асобу разнеслі паўсюль: хто я, адкуль, чый, нават рост дазналіся… Аж 8 год мне далі.

**Кіра:** На маю думку гэта вас таксама не змагло спыніць? Ваша зброя - слова не спынялася?

**Валянцін** *(не супакойваючыся)*: У тыя зняволеныя гадзіны нам даводзілася пісаць вершы з тайнымі знакамі. Такія патаемныя запіскі называлі "грыпсамі". Галоўным сродкам сувязі паміж вязнямі быў звычайны шнурок, які называўся "канём". Як толькі ссутоньвала, хтосьці з нас кідаў у суседняе акно канец шнура, дзе яго лавілі і пры дапамозе мятлы, і проста рукой. Пасля гэтага "конь" перавозіў з камеры ў камеру любую рэч. Вядома, дзейнічаць прыходзілася асцярожна, каб не заўважылі вартавыя, таму што расплачвацца ў першую чаргу даводзілася сваімі бакамі. Трэба мець на ўвазе, што за невялічкі агрызак алоўка любому з нас пагражаў карцар, а ў горшым выпадку "лічылі" сківіцы так, што потым доўга вычухваўся. Нягледзячы на гэта, я ўсё ж шмат там вершаў напісаў. Цэлы цыкл. У ім ёсць - "Лукішскія вершы".

*Чытальнік уключае аўдыёзапіс верша.*

Калі наспее ў сэрцы гром
І задрыжаць Лукішкі, -
Пішу я вершы не пяром,
Не ў запісную кніжку.

Тут і агрызак алаўка
Недатыкальней табу,
А знойдуць - аднаго чакай:
За ўсё адкажуць скабы!..

Але нашто душой крывіць?
Знайсці - не іх рукамі:
Я верш пад ззянне бліскавіц
Запісваю у памяць.

Няхай вісіць загад-пятля
І суліць карцэр, голад...
Спалі маланка вас датла,
Халодныя назолы!

Я сам і пасядзець магу,
А вершам - часу шкода:
Шумець ім трэба на сцягу
І калыхаць паходы.

Глядзі ў ваўчок як дзень, так ноч, -
Не ўбачыш, чорт зіркаты,
Што я заўзята і даўно
Пілую вершам краты.

**Кіра** *(супакойваючы)*: Ой, хапіла табе, Валянцін. Не пазайздросціш…

**Валянцін** *(узмоцнена)*: Кіра, гэта яшчэ было не ўсё. Гарадзенскі астрог мяне зноў паклікаў. Тры апошнія гады адбыў там, дзе я вытрымаў колісь свой першы экзамен на годнасць сапраўднага рэвалюцыянера. Гэта былі пакуты. Былі абмежаванні ў прагулках, пазбаўленні ў карыстанні любой літаратурай, мінімум медыцынскай абслугі, вокны замуроўвалі да палавіны, холад зімою ў адзіночках, за тое, што я быў небяспечным бунтаром і падбухторшчыкам. Выбівалі з рук пяро - дык я на падлозе надрапаю верш, каменчыкам, прынесеным з вулічнага выгулу… Грыфельнай дошкай яшчэ дазвалялі карыстацца, а не - дык на сцяне пісаў. Месцам для маёй паэзіі станавілася і памяць. Не забуду ніколі чэрвеньскі вечар 1936 года. Увесь дзень наш калектыў палітвязняў з трывогай чакаў, чым скончыцца працэс над Сяргеем Прытыцкім. У той дзень павінен быць прысуд. І вось "загаварылі" астрожныя сцены. З камеры ў камеру марзянкай-маланкай пабегла жахлівае паведамленне: Кара смерцю праз павешанне…

**Кіра** *(задуменна)*: Няўжо так і адбылося? Здаецца, усё прайшло нармальна.

**Валянцін** *(узмоцнена, разважна)*: Так, Сяргей Прытыцкі - наш чалавек. Было гэта 27 студзеня 1936 года. Раніцай. Віленскім акруговым судом вырашалася пытанне пра далейшы яго лёс. Праходзіла судовае пасяджэнне. Як толькі гэты подлы правакатар Якаў Стральчук быў запрошаны ў залу і пачаў паказваць на падсудных, называць іх прозвішчы, іх так званыя злачынствы, Прытыцкі выхапіў з кішэняў два пісталеты і рвануўся да правакатара, прыцэліўся і націснуў на абодва куркі. Суддзі і пракурор пад сталы палезлі, Стральчук упаў і пачаў курчыцца. Яшчэ дзве кулі паслаў Стральчуку. Пакуль паліцэйскія адумаліся, Прытыцкі кінуўся з залы суда. Але ж агенты рвануліся за ім і пачалі страляць. Адна куля трапіла яму ў правы, другая - у левы бок, трэцяя - у шыю, чацвёр-

тая - у руку. Прытыцкі ўпаў…У той смяротны прысуд ўсе палітвязні адмовіліся ад вячэры і крычалі: "Пратэстуем супраць смяротнага прысуду Сяргею Прытыцкаму!" Праз некалькі дзён мы атрымалі пісьмо ад Прытыцкага. Мы ганарыліся ім. Ён пісаў, што любіў сонца, кнігі, песні. Яму было 23 гады. У пісьме пазначыў, што калі надыдзе тая часіна, то ён пойдзе на шыбеніцу з горда ўзнятай галавой рэвалюцыянера, камуніста. Пасля гэтага ў мяне нават дзесьці ўнутры засела мара напісаць паэму пра таварыша Сяргея. Супраць смяротнага прысуду Прытыцкаму пракацілася хваля пратэстаў. Працоўныя патрабавалі вызвалення героя-рэвалюцыянера. Па ўсім Савецкім Саюзе, у Англіі, Францыі, Амерыцы разгарнулася барацьба за вызваленне. Міжнародная арганізацыя "Ліга абароны правоў чалавека" ў Парыжы таксама была ў ліку пратэстуючых. Тады імя Сяргея Прытыцкага стала самым папулярным у міжнародным рэвалюцыйным руху. І тады касацыйны суд у Варшаве вымушаны быў адмяніць смяротны прысуд, а Віленскі акруговы суд у другім складзе замяніў пакаранне смерцю пажыццёвым зняволеннем. Усё ж такі справядлівасць перамагла!

**Кіра** *(спачуваючы)*: Ну і давялося табе пабачыць і нават быць сведкай тых жудасных дзён. А адкуль у цябе столькі жарсці? Ты ўвесь, з ног да галавы - непераможны!

**Валянцін** *(узмоцнена)*: Усё ж апошнія дні турмы для нас ледзь не скончыліся трагічнай развязкай. 18 верасня 1939 года пад націскам рабочых турэмная адміністрацыя няхочучы пачала нас выпускаць на волю. Мы ўзброіліся, завязалася сутычка з контррэвалюцыйнымі бандамі. Усё ж не надоўга, бо вярнуліся паліцэйскія і белапалякі. Узялі нас зноў у палон, збілі прыкладамі, аддалі пад палявы суд, які прыгаварыў нас да расстрэлу. Тры дні чакалі выніку. Так, Кіра, некаторыя раптоўна на вачах сівелі. Нас было там шмат. Пестрак, Мінкевіч… Я думаю, што далей з іх атрымаюцца справядлівыя кіраўнікі. А што тут ужо было баяцца. Што суджана - тое будзе. Калі смерць, то прымаць яе мы вырашылі годна. Але і тут я да апошняга трымаўся, падбадзёрваў дух таварышаў. Я ўшчыльную да дзвярэй на ўвесь голас вырашыў дэкламаваць верш польскага паэта Уладзіслава Бранеўскага "На смерць рэвалюцыянера". Зараз я яго табе зачытаю. Ён быў змешчаны ў 1927 годзе ў кнізе "Dymy nad miastem".

Władysław Broniewski

**Na śmierć rewolucjonisty**
A z tej celi pustej i chłodnej

trzeba będzie niedługo odejść,
jeszcze spojrzeć w niebo pogodne,
jeszcze spojrzeć za siebie-w młodość.
Już za chwilę przyjdą żandarmi,
wyprowadzą bez słowa z celi...
Trzeba umieć, jak żołnierz armii,
iść spokojnie pod mur cytadeli.
Ach, umierać nie będzie ciężko,
chociaż serce ma lat dwadzieścia-
nie złamane codzienną klęską,
dziesięć klęsk, dziesięć kul pomieści!
Bo jest życie piękniejsze, nowe,
i życ warto, i umrzeć warto!
Trzeba nieść, jak chorągiew, głowę,
świecić piersią kulami rozdartą,
trzeba umieć umierać pięknie,
patrzeć w lufy wzniesione śmiało!
Aż się podłe zadziwi i zlęknie,
aż umilknie łoskot wystrzałów!

**Кіра:** І як ты выратаваўся?

**Валянцін** *(супакойваючыся)*: Ды ўсё ж падаспеўшая Чырвоная Армія, за сорак хвілін да расстрэлу змагла нас вызваліць. І мы выйшлі на волю, з-за кратаў. Хто куды накіраваўся. Я - у Ліду. Да бацькоў. Тут жа мой блізкі і дарагі сэрцу куток! Я ж тут сфарміраваўся як паэт. Тут мой першы верш "Верабейкі" быў напісаны. І вось, я тут, Кіра. З табою мы разам ужо паўтара года пражылі.

**Кіра** *(расчулена)*: Такім ты і застаўся. Усё ў працы, сваю творчую энергію, натхненне і ўменне аддаеш ёй.

**Валянцін** *(імклівa)*: Кіра, трэба расшыфраваць з памяці мой набытак, вынесены на волю з-за крат і этапных дарог. Гэта ж сотні вершаў, урыўкі паэм неабходна ўзнавіць, перанесці на паперу. Трэба ж адрэдагаваць іх, каб загучалі як сталь лацуга. Кіра, маё жыццё - гэта пастаянныя шляхі-пуцявіны і… астрогі. *(Уздыхае Таўлай і замаўкае.)* Ведаеш, я хачу выдаць зборнік вершаў і назву дам яму "Шляхі і…" (замаўкае і ціха прамаўляе) "… і краты"… *(Устае і гучна прамаўляе.)* Разумееш, Кірачка, мой лёс так склаўся. Я не магу па-іншаму. Хочаш, і табе вырабім падпольны дакумент? Ёсць людзі, якія могуць прытуліць... Такое жыццё… Трэба канспіравацца. На сваёй скуры праверана…

**Кіра:** Я бачу, што ты цэлымі вечарамі і сядзіш за сваімі вершамі.

**Валянцін** *(лагодна)*: Кіра, разумееш, гэта маё жыццё. Я не магу

каб не пісаць. Я хачу аднавіць усё, што вынес з турмаў. У мяне і па начах яны просяцца на паперу. Паступова аднаўляюцца. Ёсць закончаныя, незакончаныя, асобныя радкі і нават толькі адны назвы. *(Паказвае гэтыя паперы.)* Хачу я дапісаць яшчэ паэму пра Палессе. Першы раздзел напісаў. Сяджу над другім. "Кобрыншчыну" хачу дапісаць, "Песня пра сухар" недапісана, "Таварыш"…

**Кіра:** Ты свету белага не бачыш з-за гэтых рыфмаў.

**Валянцін** *(даверліва)*: Маё жыццё гэта і ёсць рыфма. Рыфма складная, трапная, вобразная. Верш павінен звінець. Якое маё жыццё - такія і творы. Іх я хачу, Кіра, змясціць пад адной вокладкай. Нават назву дам адпаведную - "Шляхі і краты". Ёсць магчымасць іх выдаць у Варшаве і ў Вільні.

**Кіра:** Пад сваім прозвішчам? Не баішся?

**Валянцін** *(узнёсла)*: Мае вершы застануцца свету. Няхай чытаюць іх. Не, неабавязкова пакідаць аўтарства. Хто прачытае, той здагадаецца, што напісаны яны тым, хто пабачыў жыццё. Паўлюк Сірата - гэта аўтар "Шляхоў і кратаў". Пераглядзеў іх. Дык адчуў, што не хапае абагульняльнага верша. Два тыдні назад, 7 чэрвеня напісаў яго. Натхніў Уладзімір Маякоўскі, а менавіта яго праца "Як пісаць вершы". Ведаеш, Кіра, а ў ёй ёсць шмат агульнага з маім жыццём.

**Кіра:** І што за верш?

**Валянцін:** "Аб маіх вершах". Паслухай.

Маякоўскі па-сяброўску радзіў
не збываць адразу верша з рук:
напісаў - замкні яго ў шуфлядзе,
як адлежыцца, - судзі, здавай у друк.

Не забыцца добрае парады,
колькі мог, і пан мне "дапамог",
замыкаючы замест шуфляды
з вершамі - і аўтара ў астрог.

Праўда, іх судзілі, - не затоіш, -
і шпікі, якога ні вазьмі,
кожны прысягнуў на крыж за тое,
што не вершы гэта - дынаміт

Пракурор праз кодэкса артыкул
углядаўся ў кожны мой радок,

нават пальцам асцярожна тыкаў
і ацэньваў: за радок - гадок.

Адсылаў ізноў ляжаць на нары,
шліфаваць і вершы, і бакі,
і аб друку час ад часу марыць:
жыў на свеце Скарына такі…

Наляжаліся - аж скабы забалелі
вершам, аўтару, народу-чытачу.
Вершы многія ад гэтага ссівелі,
многіх і зусім не далічу…

Толькі аднаго адкінуць нельга:
шліфаваў радок, як сталь звяна;
ланцугі тады на мне звінелі, -
можа й вершы ад таго звіняць.

**Валянцін:** Цяпер і ты яго пачула. А яшчэ чытала яго і Ніна Тарас. Прыходзіла ж сюды пару дзён назад. І ў яе ёсць нядрэнныя вершы.

**Кіра** *(незадаволена)*: Штосьці зачасціла яна да цябе. Мне гэта не падабаецца.

**Валянцін** *(гучна)*: Хопіць прыдзірацца. Гэта мая калега па працы. Я яе запрашаю. Гарбаты наліць мне не шкада ёй. На Ніну я магу спадзявацца. Яна свой чалавек.

**Кіра** *(незадаволена)*: Нешта ты пачаў давяраць ёй. Штосьці тут не ладнае.

**Валянцін** *(узмоцнена)*: Не шукай прычыны. З такім разумным, правераным чалавекам можна падзяліць усё што заўгодна. І няглядзячы хто ён: беларус, рускі, ці нават паляк, ці яўрэй. Галоўнае - каб у галаве што было. А калі ты лічыш, што ў нас штось сур'ёзнае - то тваё права. Жанчын хапала ў маім жыцці. Кацярына Главінская, Тоня Кулак… *(Уздыхаючы.)* Можа неяк сустрэнемся… Зямля ж круглая і цесная…

**Кіра** *(супакойваючыся)*: Што ж… Я пачула твой адказ. Больш мне сказаць табе няма чаго. Я лепш прамаўчу. Ты ж разумнейшы, адукаваны, граматны. Гэта ж не я - адвакат…

**Валянцін**: Добра, каб не перайшла наша гутарка ў гучную спрэчку, мне трэба пайсці па справах. Сёння хоць і нядзеля, але на гумовай фабрыцы "Ардаль" збіраюцца людзі. Мне трэба там быць. Будзем абмяркоўваць некаторыя пытанні.

**Кіра:** А мне на рынак трэба схадзіць. Можа якую абнову куплю.

*Выходзяць. Народ сядзіць у пакоі.*

**Чытальнік**: Жыццё ідзе. Валянцін працуе ў рэдакцыі газеты "Уперад", ездзіць па камандзіроўках у Лідскі раён, збірае матэрыял для газеты, сустракаецца з людзьмі, выступае з дакладамі на палітычныя і гаспадарчыя тэмы на прадпрыемствах і ва ўстановах раёна, займаецца творчай дзейнасцю, піша вершы, рыхтуе іх да друку ў зборніку. Але ж мірнаму часу прыйшоў канец. Як вядома, што першыя бомбы, скінутыя гітлераўцамі на Ліду, таксама засталі яго і супрацоўніка газеты "Уперад" Якуба Міско на мітынгу галёшнай фабрыкі "Ардаль". І Валянцін хуценька паспяшаў да хаты. У яго была адна мэта: паспець сабраць свой архіў, а менавіта, тыя вершы, што былі вынесены на волю з-за крат, тыя, што давялося нават ноччу ўзнаўляць па памяці.

**Сцэна 2.**

*Хутка прыбягаюць яны назад. Спачатку Кіра з купленай абновай на рынку, потым Валянцін з партфелем, моцна спужаны.*

**Валянцін** *(узрушаны, спужаны)*: Кірачка, ты чула? Кажуць, што вайна пачалася. Гітлераўская Германія без аб'яўлення вайны напала на Савецкі Саюз. О, чэрці.

*Валянцін уключае радыё, па якім Молатаў ці Левітан аб'явілі пра напад Германіі, пра пачатак вайны.*

**Кіра** *(разгублена)*: Што будзем рабіць? Трэба ж збіраць рэчы. Ратавацца.

**Валянцін:** Ты не спяшай, можа, усё будзе добра.

*Валянцін марудна перабірае свае паперы, раскладае вершы па пэўных тэмах. Кіра ўкладае ў чамадан гардэроб, кнігі, сваю біжутэрыю і іншае. Злосна паглядае на марудства Валянціна.*

**Кіра** *(уся стрывожаная, спалоханая, нярвовая)*: Валянцін, ты можаш хутчэй? Уключай мазгі. Падумай пра жыццё лепш. Кідай свае паперы прэч. Зразумей, вайна нікога не пашкадуе. Я - яўрэйка. Пад кулю пайду першай. А ты - рэвалюцыянер, твой лёс таксама не лепшы.

*Кіра ў парывах гневу, злосна хапае са стала паперы Валянціна, камечыць іх і выкідвае ў памыйнае вядро.*

**Валянцін** *(крычыць)*: Што ты робіш? Ты мяне загубіла. Гэта самае горшае, што мог я чакаць ад цябе.

**Кіра** *(злосна)*: Ты - маруднік. Вершы - гэта пыл. Ён брудзіць тваё жыццё. Даўно ўжо трэба было вымыць рукі. Дык няхай твае вершыкі… памыюцца, можа і ты чысцейшы станеш, праясніцца ў цябе нарэшце. Не знішчыш іх ты, то яны гэта зробяць з табою. Ты ж адчуваеш, што і да сённяшняга дня вечарамі ходзяць нейкія падазроныя каля нашай хаты.

**Валянцін** *(узахлёб)*: Кіра, вершы - гэта маё жыццё. Я зросся з імі і адрачыся ад іх я ўжо не магу, як і ад роднай зямлі. Моцна прырос. А што мне суджана, ад таго не збягу. Прайшоў я ўжо гэтыя дарогі. Быў на валаску ад смерці. Я разумею, што ты, Кіра, вельмі перапужана. Так, мне давядзецца хавацца тут у лясах, бо пра мяне і сапраўды шмат ходзіць розных чутак. Мне не прывыкаць. *(Суцішана.)* Я па магчымасці буду сачыць за нашай хатай, магчыма, што і выратую яшчэ. Я канспіравацца ўмею. Можа, і сапраўды, нашыя войскі не здадуцца і хутка адгоняць германцаў. Ты ж Брандт. Само прозвішча цябе можа выратаваць. Яно нямецкае. Немцы не павінны цябе зачапіць. Кіра, калі што, то едзь у Вільню. Там ты выжывеш. Запомні: там ёсць нашы людзі. Запомні адрас: вуліца Букавая, дом 41. Там жыве Любоў Андрэеўна Асаевіч. Цябе сустрэнуць, прымуць, уратуюць. Табе зробяць новы дакумент, ты будзеш пад другім імем і прозвішчам. На вуліцы цябе сустрэне фурман. Ён адвязе цябе па адрасе. Бяжы на рынак, на Віленскую. Я веру, я спадзяюся, што мы яшчэ сустрэнемся. Мой зборнік там таксама выйдзе ў друк. Паспрыяй мне, Кіра…

*Чутно, як падаюць снарады ў горадзе. Валянцін з Кірай абдымаецца, развітваецца. І хутка зараз жа выбягае з хаты. Кіра застаецца...Заплакала, схіліла галаву і выходзіць з пакоя моўчкі…*

**Чытальнік:** Па сямейных абставінах Валянцін Таўлай не змог падацца ў першыя гадзіны вайны на Усход. Заставацца ў Лідзе, дзе была хата бацькоў і дзе жылі яны самі, было нельга: зашмат людзей ведала, што ў Лідзе жыве такі Таўлай, які разгортваў у буржуазнай Польшчы рэвалюцыйную дзейнасць, а таксама пра яго актыўную грамадскую работу пасля вераснёўскіх дзён. Схавацца ў Скрыбаве, дзе працаваў на чыгунцы бацька паэта Павел Дзям'янавіч, таксама стала ненадзейным, бо праз пару тыдняў туды дайшлі спісы актывістаў, якіх трэба было

схапіць. Так склалася, што з даўніх часоў падпольнай арганізацыйнай дзейнасцю славілася Наваградчына. Шмат сяброў па заходнебеларускім падполлі знаходзілася там. І таму Валянцін вырашыў падацца ў тыя мясціны. Спыняецца ён у Аляксандра Карповіча - былога сябра па рабоце ў легальнай Заходняй Беларусі "Беларускай газеце", а ў Наваградку пасля акупацыі ён працаваў лесніком. Ён уладкоўвае Таўлая на пасаду пісара ў Ваўкавічах. Гэта дало магчымасць быць на віду ўлады, але і мець сувязь з насельніцтвам і быць падалей ад вачэй акупантаў. Сяляне заўважылі яго і як магнітам цягнуліся да Валянціна, даручалі свае справы. Такім чынам Таўлай знайшоў там сваіх сяброў па ранейшай барацьбе, устанаўліваў сувязь з байцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі. Там з ім знаёміцца жанчына - студэнтка 4 курса Ленінградскага інстытута кінаінжынераў Лідзія Сяргееўна Казлоўская. З-за вайны дарога яе была спынена бамбёжкамі, і жанчына знайшла прытулак у Наваградку. Там яна і пазнаёмілася з Валянцінам, з якім потым сышліся і афармілі шлюб.

Ваенныя падзеі прайшлі праз біяграфію Валянціна Таўлая. Працуючы ў Наваградку, ён разам з другімі таварышамі прымаў удзел у арганізацыі барацьбы супраць нямецкіх акупантаў. Працаваў сувязным партызанскага атрада імя Катоўскага (брыгада імя Дзяржынскага), а пасля - па спецзаданнях. Друкаваўся ў партызанскіх выданнях. Але ў якасці прыкрыцця і дапамогі ў атрыманні дадзеных ад немцаў, ён працаваў у Беларускай самапомачы, рэарганізаванай у Саюз беларускай моладзі па прапанове фашысцкага паслугача Якуцэвіча. Маючы дакументы з гэтай пасады, Валянцін разам з Лідзіяй меў магчымасць выязджаць у Вільню, Дзятлава, Баранавічы, Мінск, Ліду. 23 верасня 1943 года ў Лідзе быў арыштаваны разам з бацькам, мачыхай і 6-ці гадовай сястрой ды кінуты ў Лідскую фашысцкую турму. Праз месяц паэт быў вызвалены, раней выпусцілі яго сястру, а бацькі былі вывезены ў лагер смерці Асвенцым і адтуль не вярнуліся.

Доўгі час у Лідзе гаварылі, што Кіра Брандт была расстраляна немцамі па аб'язной дарозе, дзе стаіць помнік у памяць забітых яўрэяў. Але ж не так даўно стала вядома, дзякуючы дзённіку Максіма Танка, што Кіра падчас вайны жыла ў Вільні па падробленым дакуменце ў цешчы Максіма Танка Ганны Асаевіч, нібыта для яе была пазашлюбнай дачкой. Яе імя было Марта. Чаму там яна пражывала? Адказ такі: Валянцін Таўлай яшчэ ў 1933 годзе праводзіў нелегальны сход для сялянскіх пісьменнікаў з Заходняй Беларусі па абмеркаванні выхаду газеты "Літаратурная старонка", месцам збору тады стала хата, у якой жыла Ганна Асаевіч. Паколькі месца гэтае было бяспечнае, Валянцін і

параіў туды Кіры падацца. Падчас вайны ён ведаў, што яна там жыве.

Але як яна патрапіла ў Вільню? Па звестках, усе дарогі ў Вільню былі перакрыты, цягнікі ішлі толькі ў бок Мінска. Але, як лічаць некаторыя даследчыкі, што ў верасні-кастрычніку 1941 года адзін з рэйсаў усё-такі адбыўся ў Вільню, момант, які не прапусціла Кіра і выехала туды, дзе і засталася. Як пазначаў Максім Танк, што яна там планавала выдаць зборнік Валянціна і мела яго рукапісы.

Зусім нядаўна стала вядома, што у Вільні Кіра выйшла замуж 12 мая 1945 года за яўрэя адваката Гіршу Рольнікаса, які страціў першую жонку і старэйшую дачку ў час вайны. Яго дачка ад першага шлюбу Марыя Рольнікайтэ - пісьменніца, дзяцінства якой прайшло праз Віленскае гета і канцлагеры. Яна выдала кнігі з успамінамі, у якіх згадвае Кіру Аляксандраўну (Азрыэлеўну). У Кіры з Гіршам была дачка Ганна (Гануся), якая пакутавала на сіндром Даўна і потым памерла. Кіра, між іншым, перапісвалася з пісьменнікам Уладзімірам Калеснікам, дзялілася ўспамінамі з Янкам Шутовічам. 16 лістапада 1984 года яна памерла.

Аб тым, што Кіра была жывая падчас вайны, Валянцін ведаў. Гэта не стала перашкодай для знаёмства з Лідзіяй Сяргееўнай Казлоўскай у Наваградку, дзе яны ўзялі шлюб. Магчыма, і наведваўся ён да яе, бо меў магчымасць выязджаць за межы Беларусі, у Вільню, калі ў час ваеннага ліхалецця працаваў як быццам на фашысцкае кіраўніцтва, а ўжо пасля вайны - у музеі Янкі Купалы, і збіраў матэрыял пра песняра. Як узгадваў беларускі пісьменнік і літаратуразнавец Анатоль Клышка, Таўлай нават верш напісаў пра дваяжонства, які пасля смерці яго аўтара перадала для друку беларускаму паэту Пятрусю Макалю сама Лідзія Казлоўская падчас працы ў рэдакцыі часопіса "Маладосць". Той твор, казалі, што не захаваўся, бо занатаваны ліст ляжаў паверх усіх іншых і, магчыма, яго выкарысталі па пэўных іншых прычынах. Але верш захаваўся і быў апублікаваны.

Так ці інакш, увесь архіў, які цяпер размяшчаецца ў музеях і іншых сховішчах, захаваўся, дзякуючы Лідзіі Казлоўскай. Яна таксама памерла, у 1998 годзе, і пахавана ў Санкт-Пецярбургу. Але на гэтым ставіць кропку нельга. Яшчэ чакаюць даследчыкаў іншыя архівы, якія раскрыюць новыя звесткі пра лёс родных і сваякоў беларускага паэта Валянціна Таўлая.

# ЗМЕСТ

**У ДОМ ТВОЙ СЦЕЖКА ПРЫВЯЛА САМА…** .................................... 3

**Песні кампазітара Леаніда Шурмана на вершы паэта** ....................... 19
**Валянціна Таўлая і пра Валянціна Таўлая**
КАСТРЫЧНІЦКІ САЛЮТ.................................................................... 20
УСПАМІНЫ......................................................................................... 24
ХЛОПЦЫ............................................................................................. 27
РАНАК ПЕРАМОГІ............................................................................. 31
АДДАЮ ШЧЫРЫ ГОЛАС САЛДАЦКІ................................................... 36
ПЕРШАМАЙСКІЯ СЦЯГІ..................................................................... 39
КАМЕНЬ ЗА КАМЕНЕМ...................................................................... 43
ЯГО НАПЕВАМ ВЫПАЎ СЛАЎНЫ ЛЁС................................................ 46

**Вершы Валянціна Таўлая, напісаныя ў Лідзе.................................. 49**
WROBELKI.......................................................................................... 50
ВЕРАБЕЙКІ......................................................................................... 50
РЭДАКЦЫЯ Ў ШАПЦЫ........................................................................ 50
МАЛОЙ СЯСТРЫЧЦЫ......................................................................... 51
ДЗЯЎЧЫНКА-СВІНКА........................................................................ 51
Гэта ўсё - знаёмыя шляхі.... ................................................................ 52
ПЕРШАМАЙСКІЯ СЦЯГІ..................................................................... 53
АБ МАІХ ВЕРШАХ ............................................................................... 54
ЛІСТЫ З ТУРМЫ ................................................................................. 55
СОН ГІТЛЕРА ...................................................................................... 57
Дзе ж ты, мілая*? Нашто было нам... .................................................. 57

**Прысвячэнні Валянціну Таўлаю ......................................................... 59**
**Максім ТАНК**
ПАМЯЦІ ТАВАРЫША ТАЎЛАЯ............................................................ 60
АПОШНЯЕ ПЫТАННЕ ........................................................................... 61
**Мікола АРОЧКА**
КУРТКА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ ............................................................ 61
КАЛЯ ВЯЛІКАЙ КРАКОТКІ ................................................................... 62
ВЯЛІКАЯ КРАКОТКА ............................................................................ 63
СУСТРЭЧА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ З ЯНКАМ КУПАЛАМ ....... 64
ПЕРАД ЦЕНЕМ ТАЎЛАЯ ...................................................................... 65

**Анатоль ІВЕРС**
ЗВІНЕЦЬ КРЫШТАЛЬНЫМ ТВАІМ ВЕРШАМ ............................... 67
Ты любіў такое хараство, ... ........................................................................ 67
БЕЛАРУСЬ - ЯГО РАДЗІМА ............................................................ 68
**Ніна ТАРАС**
ПАМЯЦІ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ........................................................ 69
ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ ....................................................................... 70
ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ ....................................................................... 71
**Алесь СУЧОК**
ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ ....................................................................... 72
**Піліп ПЕСТРАК**
РЭХА ..................................................................................................... 73
**Алег ЛОЙКА**
ШКОЛА ТАЎЛАЯ .................................................................................. 74
**Юрка ГОЛУБ**
ВАЛЯНЦІН ТАЎЛАЙ ........................................................................... 74
**Сяргей ПАНІЗЬНІК**
"ПІЛУЮ ВЕРШАМ КРАТЫ" ................................................................ 75
**Алена ЯХАНТ**
В. ТАЎЛАЮ ........................................................................................... 75
**Таццяна ЯЦУК**
ДА ЮБІЛЕЮ МУЗЕЯ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ Ў СШ № 4
г. БАРАНАВІЧЫ ..................................................................................76
**Алесь КОРНЕЎ**
НЕ ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ У БЯДЗЕ .......................................................... 76
**Віктар ШНІП**
БАЛАДА ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ (8.02.1914 - 27.04.1947) ................. 78
**Людміла КЕБІЧ**
СЛОВА ЯДНАННЯ ................................................................................ 78
**Сяргей ЧЫГРЫН**
ВЁСКА РУДАЎКА ................................................................................. 79
**Станіслаў СУДНІК**
ПА ЛІДЗЕ БОГ ХАДЗІЎ ......................................................................... 80
**Уладзімір ВАСЬКО**
ТАЎЛАЙ НАТХНЯЕ ............................................................................. 81
**Алеся БУРАК**
У ВЯНОК ВАЛЯНЦІНУ ТАЎЛАЮ ....................................................... 82
**Алесь СТАДУБ**
ВЕЧНАСЦЬ РОДНАГА ДУХУ (Роздум паэта Валянціна Таўлая) ..... 83
ТУТ. Трыпціх ......................................................................................... 84

**Міхась МЕЛЬНІК**
РАЗАМ З ВАЛЯНЦІНАМ ТАЎЛАЕМ ................................................ 85
**Алесь МАЦУЛЕВІЧ**
ГОСЦІ ПАЭТА. Да 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая . 86
У ДОМІКУ ТАЎЛАЯ ........................................................................ 87
ТАЎЛАЙ У ЛІДЗЕ. Да 100-годдзя з дня нараджэння Валянціна
Таўлая ............................................................................................ 87
**Ірэна СЛІЎКО**
Неба пакрылася шэрымі хмарамі, ... ........................................................ 88
**Тарэза СМОЛЬСКАЯ**
ДОМІК ТАЎЛАЯ ........................................................................... 88
**Людмила РУСЬ**
ПОСВЯЩЕНИЕ ВАЛЕНТИНУ ТАВЛАЮ ............................................ 89
ПАМЯТИ ВАЛЕНТИНА ТАВЛАЯ ..................................................... 89
**Татьяна СЕМЕНОВА**
ПЕРВОЕ ЗНАКОМСТВО С ГОРОДОМ ЛИДА .................................. 90
РЕЛИКВИЯ ........................................................................................ 93
БОРЦУ ЗА НАРОДНОЕ СЧАСТЬЕ ..................................................... 94

**Алесь ХІТРУН**
СЦЭНАРЫЙ ДА ІНСЦЭНІРАВАНАГА АПОВЕДА
"У ТАЎЛАЯ ПАБЫВАЕМ... ПЕРАД ПАЧАТКАМ ВАЙНЫ" ....... 95

Мелодыі памяці. Да 110-годдзя з дня нараджэння Валянціна Таўлая. Мастацка-дакументальны зборнік. На беларускай мове. Ліда, ПУП “Пружмень”, 2024. 116 с.

Наклад 120 асобнікаў.

Друк RISO. Папера офісная. Фармат А-5.



**Дом Таўлая ў Лідзе**. *Здымак* 2011 *г.*